Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

7 САКАВІКА 2008 г. ПЯТНІЦА

№ 45 (26158)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## Дарагія суайчынніцы!

*Прыміце мае самыя шчырыя віншаванні з Днём жанчын.*

*Гэтае выдатнае свята — прызнанне ў любові і павазе да цудоўнай паловы чалавецтва.*

*Глыбокае захапленне выклікаюць духоўная дасканаласць, мудрасць і чароўнасць беларускіх жанчын. Прырода надзяліла вас ляшчотай, чуласцю, працавітасцю і аптымізмам.*

*Жанчыны нашай краіны бяруць актыўны ўдзел ва ўсіх сферах дзейнасці — у палітыцы, бізнесе, навуцы, культуры. Выказваю вам удзячнасць за стваральную працу на карысць роднай Айчыны.*

*Але галоўнае — вы забяспечваеце будучыню дзяржавы, даючы жыццё новым грамадзянам Беларусі. Нізкі паклон вам за гэта!*

*Асаблівая пашана старэйшым у родзе жанчынам — нашым бабулям і маці. Іх клопатам і прыкладам жывуць сямейныя традыцыі, сувязь пакаленняў і моц сваяцкіх адносін.*

*Мілыя жанчыны! Дзякуй за тое, што ў нас ёсць вы — кахаючыя і каханыя.*

*Няхай мужчынская ўвага, пакланенне і клопат стануць пастаяннымі спадарожнікамі вашага жыцця!*

*Няхай вас заўсёды акружае велікадушнасць родных і блізкіх людзей.*

*Добрага здароўя, дабрабыту, міру і згоды, веры ў свае сілы і здзяйснення ўсіх жаданняў.*

*Будзьце шчаслівымі!*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін абмеркавалі саюзнае будаўніцтва

**6 сакавіка адбылася тэлефонная размова прэзідэнтаў Беларусі і Расіі Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна.**

У час гутаркі былі абмеркаваны пытанні будаўніцтва Саюзнай дзяржавы, умацавання гандлёва-эканамічных адносін, супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы і ў галіне забеспячэння сумеснай бяспекі, узгодненыя дзеянні ў знешняй палітыцы, а таксама іншыя тэмы.

Адбылася дэталёвая размова аб перспектывах будаўніцтва алімпійскіх аб'ектаў у Краснадарскім краі Расійскай Федэрацыі з удзелам Беларусі.

## А. Лукашэнка і Д. Мядзведзеў абмеркавалі двухбаковае супрацоўніцтва і ўзаемадзеянне на міжнароднай арэне

**Тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з нядаўна выбраным Прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі Дзмітрыем Мядзведзевым адбылася 5 сакавіка.**

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз павіншаваў Дзмітрыя Мядзведзева з пераканаўчай перамогай на выбарах і пажадаў яму поспехаў у дзейнасці на гэтай высокай пасадзе.

У час размовы абмеркаваны актуальныя пытанні двухбаковага супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння на міжнароднай арэне. Была ахоплена шырокая тэматыка — ад пашырэння супрацоўніцтва ў эканамічнай сферы да пытанняў абароны.

Субяседнікі дамовіліся больш дакладна абмеркаваць гэтыя і іншыя пытанні ў ходзе маючага адбыцца візіту Дзмітрыя Мядзведзева ў Мінск.

## Колькасць зваротаў у гаспадарчыя суды штогод узрастае прыкладна на 20 працэнтаў

**Колькасць зваротаў у гаспадарчыя суды Беларусі штогод узрастае прыкладна на 20 працэнтаў. Такія даныя прывёў на сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам старшыня Вышэйшага гаспадарчага суда Віктар Камянкоў.**

На думку Віктара Камянкова, прычына гэтай з'явы ў паэтапным і паспяховым развіцці эканомікі Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка праінфармаваны аб выніках работы сістэмы гаспадарчых судоў за 2007 год.

На сустрэчы абмеркавана вырашэнне праблем гаспадарчых судоў у сферы прававога рэгулявання, у прыватнасці, па скарачэнні стратных прадпрыемстваў, спраў аб банкруцтве, аб прыцягненні замежных інвестыцый, пытанні рэгістрацыі аб'ектаў нерухомай маёмасці. Закрануты таксама пытанні змяншэння нагрузкі на суддзяў, якая цяпер складае больш як 80 спраў у месяц на кожнага суддзю, паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнай базы гаспадарчых судоў і некаторыя іншыя тэмы.

## Беларусь гатова да цеснага супрацоўніцтва з Міжнароднай федэрацыяй хакея

**Аб гэтым заявіў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з прэзідэнтам Міжнароднай федэрацыі хакея Рэнэ Фазелам.**

«Упэўнены, што пройдзе некалькі гадоў, і Беларусь заявіць аб сабе як аб вялікай хакейнай дзяржаве, заняўшы дастойнае месца ў адпаведным табелі аб рангах», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «У нашай краіне робіцца ўсё, каб ператварыць яе ў хакейную дзяржаву сусветнага ўзроўню», — падкрэсліў ён.

У сваю чаргу кіраўнік федэрацыі запэўніў кіраўніка дзяржавы: «У тым, у чым мы можам дапамагчы развіццю хакея ў Беларусі, мы зробім усё магчымае».

Аляксандр Лукашэнка ўручыў Рэнэ Фазелу вышэйшую спартыўную ўзнагароду краіны — ордэн Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь. «У гэтым годзе мы адзначаем сто гадоў хакея. У сувязі з гэтай датай, а таксама вашым рэвалюцыйным укладам у хакей алімпійскі камітэт прыняў рашэнне ўзнагародзіць вас гэтым ордэнам», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. «Я дзякую вам за актыўную падтрымку нашай краіны ў развіцці гэтага вялікага віду спорту. Тое, што Міжнародная федэрацыя хакея робіць для Беларусі, вельмі важна», — дадаў ён.

Рэнэ Фазел, падзякаваўшы за ўзнагароду, выказаў надзею, што яго візіты ў Беларусь будуць больш частыя. «Я ведаю, як многа вы зрабілі для гэтага віду спорту», — сказаў госць. Рэнэ Фазел адзначыў, што ў федэрацыі і ў яго асабіста наладзіліся вельмі добрыя адносіны з кіраўніцтвам беларускага хакея.

У гутарцы з журналістамі па выніках сустрэчы кіраўнік Міжнароднай федэрацыі хакея выказаў перакананне, што ў Беларусі ёсць добрыя шанцы ўвайсці ў вялікую хакейную васьмёрку.

«У Беларусі вялікая будучыня для заваявання медалёў у гэтым відзе спорту, — сказаў госць. — У вашай дзяржаве робіцца ўсё для якаснага развіцця хакея».

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## МОЦ СЛАБАГА ПОЛУ

**17 непаўторных жанчын сабраліся напярэдадні Міжнароднага жаночага дня ў Грамадскім прэс-цэнтры Дома прэсы для таго, каб нават адной сваёй прысутнасцю пацвердзіць заяўленую тэму сходу: «Ты — женщина, и этим ты права...».**

Сустрэча паказала, што сучасная беларуская жанчына — вельмі моцная, здольная фактычна на любы, нават самы мужны ўчынак, напрыклад, на скачок з парашутам (на які ўсур'ёз маюць намер адважыцца некаторыя ўдзельніцы «круглага стала»). Большасць з прысутных паспяваюць у сваім жыцці і кіраваць іншымі, і трымаць у парадку сям'ю, і хадзіць у трэнажорную залу, рабіць манікюр-педыкюр, і г.д. Адзінае, на што не хапае часу, дык гэта на слабасці.

Першы намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь **Лілія АНАНІЧ** сцвярджае, што ёй слабасці ў прынцыпе не ўласцівыя. Паводле слоў старшыні Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў **Лідзіі ЯРМОШЫНАЙ**, і ў рэдкія хвіліны вольнага часу — ніяк не да слабасцяў, неабходна асэнсаваць зробленыя памылкі і спланаваць будучыню. Салістка ансамбля «Сябры» **Алеся** «гадуе» і 8-гадовага сына, і калектыў з 9 чалавек, а расслабіцца можа хіба адзін на адзін са сваімі бацькамі, якія цудоўна яе разумеюць. Дырэктар Івянецкага дома-інтэрната для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі фізічнага развіцця **Алена ПЕТРАШКЕВІЧ** кажа, што не можа быць нешчаслівай ці незадаволенай, калі 80 дзяцей глядзяць табе ў вочы і называюць мамай. Прафесар кафедры кардыялогіі і рэўматалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктар медыцынскіх навук **Эма РУДЭНКА** мяркуе, што адзіная яе слабасць — унукі. А спявачка, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь **Іна АФАНАСЬЕВА** прыпісвае магчымасць быць слабай толькі па-сапраўднаму моцнай жанчыне. Нашы слабасці — гэта нашы хітрасці, а ў прынцыпе жанчына па сваёй сутнасці ніяк не можа быць слабай, упэўнена дырэктар гімназіі № 1 г. Ліды, заслужаны настаўнік Беларусі, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве **Наталля ЗАЙЦАВА**. Заслужаны майстар спорту, чэмпіёнка Гульняў XXVII Алімпіяды ў Сіднэі **Эліна ЗВЕРАВА** разважае цалкам па-жаночы: «Часам дазволіш сабе слабасць, а потым думаеш — і навошта гэта было? Столькі спраў не перароблена...». А на думку прадстаўніцы Беларускай Праваслаўнай царквы **Жаны ЖДАНОВІЧ**, жанчыны ўсё ж такі павінны быць слабымі, інакш мужчыны могуць страціць сваю моц... Дырэктар Грамадскага прэс-цэнтра Дома прэсы **Таццяна БЯЛОВА** заклікала ўсіх мужчын хоць бы ў гэты святочны дзень не забывацца на добра ўсім вядомыя, мудрыя словы: «Калі жанчына не мае рацыю, папрасці ў яе прабачэння».

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Наша чароўная Гісторыя




Фота БЕЛТА.

**15 гадоў працуе настаўнікам гісторыі ў Віцебскай гімназіі № 1 Алена Анатольеўна Кунашка. Напярэдадні Міжнароднага Дня 8 Сакавіка рашэннем Віцебскага аблвыканкама ёй прысвоена званне «Жанчына года Віцебшчыны» ў намінацыі «Жанчына ў сістэме адукацыі».**

Надвор'е

## Вясна ідзе, на наступным тыдні — да плюс 12

**У гэтыя выхадныя да нас завітае малаактыўны атмасферны фронт, таму у суботу месцамі па краіне невялікі дождж, — паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў.**

У асобных раёнах 8 сакавіка чакаецца туман і слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы — 0—6 марозу, удзень — 3—9 цяпла. У нядзелю ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу будуць назірацца па ўсёй тэрыторыі краіны. Месцамі невялікі туман, уначы і раніцай слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 3 градусаў да плюс 2, удзень — плюс 2—9 градусаў.

Згодна з папярэднімі прагнозамі, у пачатку наступнага тыдня будзе даволі воблачна, месцамі чакаецца дождж. З аўторка да нас пачне паступаць больш цёплае паветра з боку паўднёвага захаду Еўропы. Тэмпература паветра ўначы ад 0 да плюс 5 градусаў, удзень — 3—12 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ПЕНСІЙНАЯ ТЭМА: ЯКІЯ ПРАБЛЕМЫ?

Вылічэнне стажу і каэфіцыенту, магчымасць пераходу з аднаго віду пенсіі на іншы, ільготы «датэрміноўшчыкам», змяненні ў пенсійным заканадаўстве — усё гэта стане тэмамі чарговай «прамой лініі» газеты «Звязда» з удзелам начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціны Вікенцьеўны КАРАЛЁВАЙ.

Такім чынам, увага! Згодна з папярэдняй дамоўленасцю, наша «прамая лінія» будзе праходзіць **11 сакавіка з 11.00 да 12.30** па рэдакцыйных тэлефонах (8 017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія званкі прымаюцца па нумары 287 17 57.

## АД «КАРЫСНЫХ ВЫКАПНЯЎ» ДА ПАЛЁТАЎ У НЕБА

### Усё гэта мужчыны робяць дзеля таго, каб нас парадаваць

**Жанчыны любяць усё прыгожае. Гэта аксіёма. З адным толькі важным удакладненнем: прыгожае не абавязкова павінна быць матэрыяльным, рэчыўным. Яно, натуральна, прыемна — атрымаць на свята ў падарунак мільён пунсовых ружаў, пярсцёнак з каштоўным каменем, новы аўтамабіль ці што там яшчэ. Аднак гэтак сама жанчыны здольныя радавацца любым дробязям — ранішняй SMS «Са святам, каханая!», звязцы паветраных шарыкаў за акном ці незапланаванай вандроўцы па рамантычных мясцінах.**

**Гэткія ўчынкі прыгожы пол асабліва цэніць і з любоўю перабірае ў памяці. Галоўнае, не забыцца паведаміць, што ўсё гэта зроблена выключна і толькі дзеля яе. Зрэшты, на словах мужчыны гатовыя практычна на ўсё — хоць Месяц з неба, хоць рай у шалашы, хоць смецце штодня без напамінаў выносіць, «не піць, не паліць і кветкі заўжды дарыць»... А на справе? Пра гэта мы і спыталіся, прычым адразу ў адрасатаў — жанчын.**

### На якія ўчынкі здольныя мужчыны дзеля жанчын?

**Наталля МЫСЛІВЕЦ, студэнтка:**

— Пару гадоў таму якраз на зыходзе зімы я сур'ёзна захварэла на грып, які ніяк не хацеў ад мяне адчапляцца. Літаральна ляжала пластом, зрэдку блукала па кватэры, як зомбі, і адчувала сябе закінутай, нікому не патрэбнай. Але праз некалькі дзён нечакана прыехаў мой сябар Віталь і наладзіў суцэльнае «вітаміннае свята» — прывёз апельсіны, яблыкі, ківі, яшчэ нейкую садавіну, і склаў з іх на блюдзе мазаіку — усмешлівы тварык. Рамантычных камедый некалькі прывёз, увогуле, цацкаўся са мной да ночы, а потым з'ехаў. Толькі пасля выздараўлення я даведалася, што ён спазніўся на апошнюю электрычку і вымушаны быў ісці дадому пешшу, па рэйках. А калі некаму гэты ўчынак падасца недастаткова гераічным, удакладню — на той час Віталь жыў у Фаніпалі!

**Вольга ЦІМАФЕЕВА, настаўніца англійскай мовы:**

— Я пазнаёмілася са сваім маладым чалавекам па Інтэрнэце. Праз паўгода нашай перапіскі ён нарэшце прыехаў да мяне ў госці з Германіі, але вырвацца ў яго атрымалася толькі на 3 гадзіны. Мы дасюль разам. Узгадваю яшчэ адзін яго гераічны і адначасова прыгожы ўчынак: аднойчы каханы падарыў мне букет. Каб нарваць кветак, ён пераплыў раку шырынёй каля паўкіламетра, а назад яму давялося грэбці адной рукой, бо букет каханы трымаў пад вадою, каб я не пабачыла сюрпрыз датэрмінова. Я была вельмі ўзрушаная.

**Ала ЗЯНЕВІЧ, псіхолаг:**

— Некалі, каб уразіць мяне і каб я нарэшце згадзілася ўзяць шлюб, малады чалавек паабяцаў мне падарыць скуру і галаву забітага мядзведзя. І зрабіў гэта! Мой цяперашні муж аказаўся больш рамантычным. Ён прыгожа да мяне заляцаўся і, калі прапаноўваў мне руку і сэрца, падарыў мне вядро маліны. У мяне ёсць сяброўка, дзеля якой яе каханы чалавек наогул гатовы на ўсё. Аднойчы ён заказаў белы лімузін, каб ехаць у тэатр, напоўніў ванну жонкі шампанскім і выкупаў яе.

**Таццяна МАЗУРКЕВІЧ, спартсменка (сучаснае пяцібор'е):**

— У маім жыцці была прыемная нечаканасць пасля майго вяртання з трэніровачнага збору: калі я выйшла на вуліцу да сваёй машыны, то пабачыла, што яна ўся ў паветраных шарыках і мностве розных надпісаў накшталт «Я цябе кахаю». Вось гэта быў сюрпрыз! Аднак адмывала я аўто доўга.

**Аксана ФУРС, служачая:**

— Яшчэ, калі я была студэнткай, адзін мой прыхільнік прыгатаваў мне казку на Дзень нараджэння. Свята я сустрэла на паветраным шары. Эмоцыі ад гэтага не перадаць. Больш такіх яскравых учынкаў дзеля мяне ніхто не рабіў, нават мой муж.

**Юлія ПАПОВА, фатограф:**

— Дзеля мяне аднойчы малады чалавек прыгатаваў торт і запаліў свечкі па ўсёй кватэры. Быў яшчэ цікавы выпадак, калі юнак падарыў мне торт. Я каталася на каньках, таму і салодкае давялося есці ў сугробе.

**Кацярына ВАЛАВА, перакладчыца:**

— Не магу пахваліцца, што мае мужчыны радавалі мяне небывалай рамантыкай і буйствам фантазіі: далей кветак, цукерак, тортаў і цацак неяк не даходзіла. Аднак аднойчы, падчас майго пражывання ў інтэрнаце, на 8 Сакавіка мне падарылі мяшок бульбы, прычым на поўным сур'ёзе. Сяброўкі за гэта і цяпер мяне клічуць бульбяной прынцэсай.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК, Ірына ПРЫМАК.**

## СЎШЫ САМ

### *Азнаёміўшыся з нашымі парадамі, кожны мужчына зможа сам прыгатаваць сушы. І не толькі 8 сакавіка*

**Раней «не цярпеў жаночых рук» хіба што шашлык, цяпер тое ж кажуць яшчэ і пра сушы — японскую рысава-рыбную страву, надта папулярную ў беларусаў апошнім часам. Паводле адной гіпотэзы, у мужчын значна больш рэцэптараў на кончыках пальцаў, што дазваляе ім раскладваць рыс амаль ювелірна, а гэта ў сушы — палова поспеху. Гіпотэзу гэтую некаторыя аспрэчваюць, аднак жанчыны, мяркую, з задавальненнем з ёю пагодзяцца. Ёсць спрэчкі і наконт назвы — «сушы» ці «сусі» — каб спрачацца не давялося, патлумачым: японская фанетыка не ведае шыпячых гукаў, і страву там называюць «сусі», аднак варыянт з шыпячым гукам больш звыклы для беларускага вуха, таму мы яго і абралі.**



Пакаштаваць сушы сёння не праблема — страву не прапануюць хіба што лянівыя рэстаратары: нікога ўжо не здзіўляе, што сушы падаюць не толькі ў японскіх рэстаранах, але і ў кавярнях з лацінаамерыканскім ці еўрапейскім меню. Попыт ёсць — будзе і прапанова. Заказаць страву можна і дамоў: па тэлефоне ці праз Інтэрнэт у тых жа рэстаранах ці спецыяльных службах дастаўкі. Аднак нішто так не парадуе вашу каханую, як сушы, якія прыгатавалі вы самі.

Майстар-клас для чытачоў «Звязды» праводзіць **повар сталічнай кавярні «Мон кафэ» Яўген САДОЎСКІ**, які гатуе сушы ўжо тры гады і стажыраваўся ў японскіх спецыялістаў.

Прынамсі, ён прыкмеціў, што папулярнасць японскай стравы ў беларусаў расце год ад году: «Раней у нас сушы гатаваў адзін повар у змену, прычым без асаблівага напружання, а цяпер удваіх ледзь спраўляемся». Атрымаць персанальны ўрок у «Мон кафэ» можна па нядзелях, калі праходзяць сямейныя абеды, дзе вы ўсёй сям'ёй зможаце авалодаць майстэрствам прыгатавання сушы пад кіраўніцтвам прафесійных павароў, а пасля, зразумела ж, пакаштаваць тое, што згатавалі самі.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

Ведай нашых!

## ПРЫГОЖАЯ ЦІ РАЗУМНАЯ? І ТОЕ, І ДРУГОЕ!

### ПАРТРЭТ ІДЭАЛЬНАЙ БЕЛАРУСКІ СКЛАДАЕМ РАЗАМ

***У кожнай жанчыне спрадвеку існуе загадка. І не адна. Выглядаць на мільён, атрымліваючы сярэднестатыстычную зарплату. Мець асіную талію і пры гэтым не адмаўляць сабе ў смачных стравах, ды яшчэ не перанапружвацца ў спартзале. Ці тлумачыць усё на свеце з дапамогай жаночай логікі — зусім нелагічна, але ў выніку правільна! Усё гэта, як і пытанне, якая яна, ідэальная жанчына, — вялікая таямніца для мужчынскіх розумаў. Аднак карэспандэнты «Звязды» ўзялі на сябе смеласць адкрыць формулу ідэальнага вобразу беларускі. Пры гэтым мы не сталі аддаваць перавагу толькі знешнім ці толькі ўнутраным кампанентам характару, а надзялілі гэты вобраз рысамі і якасцямі нашых вядомых сучасніц.***



Сустракаюць, як кажуць, па вопратцы, у сэнсе, знешнім выглядзе, а значыць, спачатку патрэбна выбраць дзяўчыну, якая і будзе ўвасабляць тыповую беларускую постаць. Сярод вялікай колькасці прыгажунь мы спыніліся на **КАЦЯРЫНЕ ДАМАНЬКОВАЙ**, бо мінчанка адпавядае не толькі міжнародным стандартам характару як пераможца конкурсу «Супермадэль свету», але і ўвогуле славянскаму тыпу знешнасці. Акрамя таго, сама дзяўчына неаднойчы прызнавалася, што не сядзіць на дыетах, маўляў, добрая фігура і прывабнасць дасталіся ёй ад прыроды, а значыць, Каця ажыццяўляе сабой вобраз натуральнай прыгажосці.



Але адна толькі знешнасць нічога не каштуе без абаяльнасці. Тут ніхто з нашых сучасніц не пераўзыдзе маленькую **КСЕНІЮ СІТНІК**, якая сваёй непасрэднасцю і задорам падкупіла ўсю Еўропу на дзіцячым конкурсе «Еўрабачанне».



Прывабіць да сябе людзей — адна справа, гэта можа зрабіць і анекдатычная бландзінка з вялікім бюстам. Нездарма ж усе мужчыны так ці інакш адзначаюць важнасць унутранага зместу прыгожага «сасуда». Вытанчанасць, далікатнасць, выдатныя манеры, інтэлігентнасць, выхаванасць — увесь гэты набор якасцяў, які існуе з часоў дарэвалюцыйных інстытутаў высакародных паненак і сёння ніхто не адмяняў. У постаці ідэальнай беларускі ўвасобіць гэтыя якасці зможа рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў **ЯДЗВІГА ГРЫГАРОВІЧ**.

Грацыёзнасць для складання ідэальнага вобраза беларускі мы пазычым у сярэбранай прызёркі Алімпіяды-2000 па мастацкай гімнастыцы **ЮЛІІ РАСКІНАЙ**, камунікабельнасць і голас — адпаведна у заслужаных артыстак Беларусі **АЛЕНЫ СПІРЫДОВІЧ** і **ІРЫНЫ ДАРАФЕЕВАЙ**.







Спраўляцца з жыццёвымі калізіямі і ўладжваць канфлікты яшчэ на стадыі іх узнікнення жанчынам заўжды дапамагае пачуццё гумару. Яго мы возьмем ва ўраджэнкі Брэста **АЛЕНЫ ВАРАБЕЙ**.





Хоць жанчына — слабы пол, ёй усё ж такі не пашкодзіць мець моцны характар, сілу духу і спартыўную загартоўку. Усімі гэтымі якасцямі буз сумнення валодае шматразовая чэмпіёнка свету па акадэмічным веславанні **КАЦЯРЫНА КАРСТЭН**.



Каб наша беларуска была добрай гаспадыняй, ёй патрэбна ўмець распараджацца грашыма — а лепш і прымнажаць іх, напрыклад, як гэта робіць старшыня праўлення «Беларусбанка» **НАДЗЕЯ ЕРМАКОВА.** Дарэчы, у Надзеі Андрэеўны можна таксама павучыцца сумяшчаць фінансавую дзейнасць з грамадскай — ёй жа хапае часу і на банкаўскую сферу, і на кіраўніцтва Саюзам жанчын.



Час рамантычных тургенеўскіх паненак мінуў, і сучасных жанчын усё часцей уяўляюць у вобразе дзелавой асобы. Дзелавая хватка, інтэлект, але разам з тым і выключна жаночая дыпламатычнасць, майстэрства знаходзіць кампрамісы — усё гэта ёсць у маладой і таленавітай **НАТАЛЛІ ПЯТКЕВІЧ.** Яна і палітык (намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі), і навуковец (кандыдат юрыдычных навук) у адной асобе.



І ўсё ж уменне выжываць у свеце «офісных джунгляў» і самая моцная дзелавая хватка ні ў якім выпадку не павінны замяняць і пазбаўляць нашу ідэальную беларуску такой жаночай якасці, як міласэрнасць і ўменне аблегчыць чужы боль. Як гэта зрабіць, дакладна ведае нядаўна прызначаная на гэту пасаду намеснік міністра аховы здароўя, галоўны санітарны ўрач рэспублікі **ВАЛЯНЦІНА КАЧАН.**



А яшчэ ідэальная жанчына — абавязкова маці. Нават калі яна не мае сваіх дзяцей, то валодае здольнасцю і схільнасцю клапаціцца пра слабейшых. У гэтым, напэўна, заключаецца маленькі жаночы штодзённы подзвіг. Здзяйсняць яго, не чакаючы ўзнагароды — справа, вартая сапраўды моцных жанчын. Гэта вам пацвердзіць і прыклад маці-выхавальніцы дзіцячага дома сямейнага тыпу ў Клічаве **МАРГАРЫТЫ КУНДЗІКАВАЙ**, якая выхоўвае 24 прыёмныя дзяцяці.

...Вобраз ідэальнай жанчыны кожны малюе пасвойму. Але мы ўпэўненыя, што ў кожнай з нашых чытачак — маці, дочках, сёстрах, бабулях, цётках, цешчах, суседках, сяброўках, калегах — ёсць рысы, без якіх гэты ідэальны вобраз быў бы няпоўным. Прыгадайце аб іх. І скажыце «дзякуй» вашым — нашым, беларускім — ЖАНЧЫНАМ.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК, Ірына ПРЫМАК.**

## Конкурс на сушуканне прэміі ўрада за дасягненне ў галіне якасці

**Аб'яўлены юбілейны, дзесяты, конкурс на сушуканне прэміі ўрада Беларусі за дасягненне ў галіне якасці ў 2008 годзе, паведамілі БЕЛТА ў Дзяржстандарце.**

Прэтэндаваць на сушуканне прэміі могуць юрыдычныя асобы ўсіх формаў уласнасці. Лаўрэаты будуць вызначацца па наступных напрамках дзейнасці: вытворчасць нехарчовых тавараў бытавога прызначэння, вытворчасць харчовых тавараў і сельскагаспадарчай прадукцыі, вытворчасць прадукцыі вытворча-тэхнічнага прызначэння (акрамя ўзбраення і ваеннай тэхнікі), аказанне паслуг, выкананне работ.

Заяўкі на ўдзел у конкурсе прадстаўляюцца да 1 ліпеня гэтага года ў сакратарыят камісіі, сфарміраваны пры Дзяржаўным камітэце па стандартызацыі Беларусі. Лаўрэатаў вызначаць па выніках праверкі прадстаўленых прадпрыемствамі матэрыялаў і шляхам правядзення экспертызы на месцах.

Лаўрэаты аб'яўляюцца на спецыяльнай цырымоніі ў час рэспубліканскіх мерапрыемстваў, прымеркаваных да Сусветнага дня якасці. Ім уручаюцца дыплом і сімвал прэміі, а таксама прадастаўляецца права выкарыстання ў маркіроўцы прадукцыі, дакументацыі і ў рэкламных матэрыялах відарыса эмблемы прэміі. Штогод выдаецца каталог лаўрэатаў конкурсу, які рассылаецца ў прадстаўніцтвы Рэспублікі Беларусь за мяжой.

У Дзяржстандарце адзначылі, што галоўнымі крытэрыямі для ўдзелу ў конкурсе з'яўляюцца дасягненне значных вынікаў у галіне забеспячэння якасці выраблянай прадукцыі, выконваемых работ або аказваемых паслуг, павышэнне іх канкурэнтаздольнасці, выкарыстанне высокаэфектыўных метадаў кіравання якасцю, задавальненне запытаў спажыўцоў. Мадэль і крытэрыі прэміі дапрацаваны і гарманізаваны з крытэрыямі аналагічнай прэміі СНД.

Прэмія Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці заснавана пастановай Савета Міністраў ад 5 лістапада 1998 года № 1705. Пачынаючы з 1999 года яе лаўрэатамі сталі 152 арганізацыі розных галін прамысловасці і сферы паслуг.

## КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 7.03.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 146,00 |
| 1 еўра | 3 291,11 |
| 1 латвійскі лат | 4 723,23 |
| 1 літоўскі літ | 953,35 |
| 1 чэшская крона | 131,71 |
| 1 польскі злоты | 931,40 |
| 1 расійскі рубель | 89,66 |
| 1 украінская грыўня | 425,01 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 24,9477 |
| 10 UAH | 47,2048 |
| 1000 BYR | 11,1429 |
| EUR | 36,6204 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 6.03.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

ISSN 1990 - 763X

08045

# XXI — СТАГОДДЗЕ ЖАНЧЫН

**На думку члена Камісіі па адукацыі, культуры і навукова-тэхнічным прагрэсе Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Лілії КАШАНКОВАЙ, імклівымі тэмпамі пачынаецца стагоддзе актыўнасці жанчыны ва ўсіх галінах.**

Жанчыны прадстаўлены сёння ва ўсіх галінах сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага жыцця, у органах дзяржаўнай улады і грамадскіх арганізацыях, у галіне аховы здароўя, гандлёвым і бытавым абслугоўванні, прамысловасці і сельскай гаспадарцы нашай краіны.

Так, у парламенце краіны жанчыны складаюць 30,3 працэнта, а ў мясцовых Саветах дэпутатаў усіх узроўняў — 45,7. Чатыры жанчыны прадстаўляюць Беларусь на міжнароднай арэне ў рангу пасла, адна — міністр, трынаццаць — намеснікі міністраў. Сярод дзяржслужачых усіх узроўняў управлення — 66 працэнтаў жанчын. Сярод суддзяў — 50 працэнтаў, адвакатаў — звыш 60, натарыусаў — 90. Няшмат жанчын прадпрымальніц. Мала жанчын у выканаўчых органах улады, жанчын-кіраўнікоў — 16 працэнтаў. Больш за палову занятых у народнай гаспадарцы — гэта жанчыны з вышэйшай адукацыяй, у навуцы — 52 працэнты жанчын, сярод аспірантаў — 54, дактарантаў — 45.

Самай масавай, уплывовай, аўтарытэтнай жаночай грамадскай арганізацыяй у краіне з'яўляецца грамадскае аб'яднанне «Беларускі саюз жанчын», які налічвае ў сваіх шэрагах звыш 170 тысяч жанчын.

Сёлета, у Год здароўя, арганізацыя сумесна з Міністэрствам аховы здароўя працягвае такія акцыі, як «Здароўе жанчыны — здароўе нацыі» і «Жанчыны супраць п'янства жанчын», а таксама распачала новы праект — «Дапамажам хворым дзецям».

Паводле слоў намесніка старшыні БСЖ Рэгіны ДАВІДОВІЧ, напярэдадні свята самы час нагадаць нашым жанчынам аб неабходнасці клапаціцца пра сваё здароўе, адмовіцца ад шкодных звычак.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ЖАНЧЫН ГОДА ВЫБЕРУЦЬ У БЕЛАРУСІ

**Беларускі саюз жанчын аб'явіў рэспубліканскі конкурс «Жанчына года», паведаміла на прэс-канферэнцыі намеснік старшыні саюза Рэгіна Давідовіч.**

Жанчын года выберуць у пяці намінацыях: «За лідарства і паспяховае кіраўніцтва», «За актыўную грамадскую дзейнасць», «За дасягненні ў выхаванні дзяцей», «За дабрачыннасць і міласэрнасць», «За жаночую мужнасць». «Конкурс дасць магчымасць расказаць аб лепшых жанчынах Беларусі, паказаць ролю жанчын у сучасным грамадстве, іх уклад у выхаванне дзяцей, умацаванне сям'і, здароўе нацыі, сацыяльна-эканамічнае і гуманітарнае развіццё рэспублікі, а таксама павысіць сацыяльны статус жанчыны і прыцягнуць увагу да грамадскай значнасці жанчыны-маці», — адзначыла Рэгіна Давідовіч. Конкурс, які праводзіцца пры інфармацыйнай і кансультацыйнай падтрымцы Міністэрства інфармацыі і Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі, будзе доўжыцца год.

**БЕЛТА.**

# СУ́ШЫ САМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Для сённяшняга нашага кулінарнага эксперыменту пад кіраўніцтвам Яўгена спатрэбяцца рыба, агародніна, гары, васабі, норы, соевы соус, рысавы воцат і спецыяльны японскі рыс — каротказярністы і вельмі клейкі (што дазваляе яму добра трымаць форму). «У Японіі гэты гатунак рысу самы дарагі, — адзначае Яўген. А ў нас самы дарагі (кіло рысу каштуе звыш 10 тысяч рублёў) — застаецца дадаць нам. Спецыяльныя прадукты можна набыць на харчовым рынку ў Ждановічах і ў гіпермаркетах, адразу папярэджваем, што японскія ласункі — не з танных. Аднак для каханай нічога не шкада, праўда?

### Закручваем рулет

Самае галоўнае, на што трэба звярнуць увагу пры гатоўцы сушы-ролаў: прадукты павінны быць адборнымі і свежымі, наразаць усё варта вельмі дробна, каб лягчэй закатвалася.

Для адной порцыі ролаў «Сяке ояко макі» (першае слова ў назве перакладаецца як «ласось», другое — «пяшчотнасць», а трэцяе ўказвае на тое, што гэта сушы ў ролах) спатрэбіцца 120 г рысу, 1 ліст норы (прычым не цалкам, а толькі тры чвэрці), 40 г свежага ласося, некалькі тонка нарэзаных палосак агурка, 15 г чырвонай ікры, а для японскага гарніру, з якім падаюцца сушы, — дробка гары, васабі і порцыя соевага соусу.

Рыс рупліва прамываем — пакуль вада не стане абсалютна празрыстай, потым вымочваем у свежай вадзе хвілін 10—15, пасля чаго ваду зліваем. Варыць рыс лепш за ўсё ў спецыяльнай рысаварцы, калі ж яе няма — у каструлі з тоўстым дном. Вады наліваем столькі, колькі трэба, каб пакрыць рыс, і яшчэ на адну дзесятую частку больш. Накрываем крышкай, даводзім да кіпення і гатуем на вялікім агні пяць хвілін. Пасля варым яшчэ хвілін дзесяць на мінімальным агні, каб рыс увабраў усю ваду. Здымаем з агню, накрываем і пакідаем «папарыцца» яшчэ хвілін дзесяць. Пасля гэтага перакладваем рыс у вялікую міску, дадаём спецыяльнага рысавага воцату, цукру і марской харчовай солі (з разліку дзве сталовыя лыжкі воцату, дзве сталовыя лыжкі цукру і паўтары сталовыя лыжкі солі на 300 грамаў рысу), усё перамешваем. Затым энергічнымі рухамі вееру астуджаем рыс да тэмпературы чалавечага цела.

Цяпер пра рыбу: японцы часцей за ўсё выкарыстоўваюць у сушы сырую рыбу, аднак калі гэта ваша першае знаёмства з японскай кухняй, лепш усё ж не рызыкаваць і купіць грыліраваны ці вэнджаны вугор. Дарэчы, Яўген запэўніў нас, што з нарачанскага вугра сушы атрымліваюцца проста аб'ядзенне.

Для закручвання інгрэдыентаў у рулет спатрэбіцца бамбукавы дыванок. Яго няблага завярнуць у цэлафан — з гігіенічных меркаванняў і для найлепшай закруткі, каб у шчыліны не забіваліся кавалачкі рысу, рыбы ды іншых прадуктаў. На дыванок кладзём прамавугольны ліст норы грубым бокам уверх, доўгім — да сябе. Адрываем ад яго адну палоску (адну чацвёртую частку ліста, якая яшчэ спатрэбіцца нам у прыгатаванні нігіры-сушы), наверх раўнамерна выкладаем рыс, пакідаючы двухсантыметровую каёмку ўздоўж доўгага боку ліста. Ні ў якім разе не прыціскаем рыс — так ён будзе больш далікатны і мяккі. Сярэдзіну рысавага пласта злёгку змазваем васабі у якасці [illegible], зверху кладзём палоскі агурка, паралельна ім укладваем ломцікі ласося, дадаём ікры, пасля змочваем каёмку, непакрытую рысам — можна закручваць! Бяромся за край дыванка, фіксуем наш рулет *(фота 1)*, падкочваем наперад і закручваем — туга, аднак без трамбоўкі. Убіраем дыванок — атрымаўся круглы рулет. Напрактыкаваўшыся ўдосталь, можна будзе закручваць рулеты і квадратнай, і нават трохвугольнай формы. Можна крыху пападбіваць краі, падраўняць іх. Далей рулет разразаем на ролы. Каб яны атрымаліся роўнымі па таўшчыні, рэжам спачатку папалам, потым кожную частку яшчэ два разы папалам — атрымалася восем кругляшоў. Пры нарэзцы таксама можна эксперыментаваць — рэзаць пад вуглом.

Гэта далёка не адзіны варыянт сушы, начыняць можна ўсім, што падкажа ваша фантазія.




**СУШЫ-СЛОЎНІК:**

***Футамакі*** *— вялікія рулеты сушы, звычайна з пяццю начынкамі.*

***Тэмакі*** *— скручаныя кулёчкі норы, напоўненыя рысам з начынкамі.*

***Урамакі*** *— сушы-ролы «навыварат» (норы ўнутры, рыс — звонку).*

***Нігіры*** *— сушы, якія лепяцца рукамі, падаюцца на лісці зялёнай салаты, а зверху на іх кладзецца сырая рыба.*

***Норы*** *— тонкія лісты высушаных марскіх водарасляў, у якіх хрусткая тэкстура, аднак яны здольныя змякчацца ад вільгаці ў рысе.*

***Васабі*** *— вострая зялёная паста з японскага хрэна (прадаецца ў цюбіку — у гатовым выглядзе, ці ў парашку — трэба будзе развесці з вадой).*

### Лепка сушы

Урокі лепкі давядзецца ўзгадаць падчас прыгатавання нігіры-сушы. Прапорцыі тут вельмі простыя — рысу і ласося ўзяць у роўных долях. З рысу акуратна і пяшчотна, не прыціскаючы, скруціць кругляш. Так жа мякка трэба і фармаваць, надаючы прамавугольную форму. Змазаўшы зверху васабі, накрываем ломцікам ласося, краі абцягваем, каб яны адпавядалі форме рысу. Нібы стужкай перахопліваем упоперак тоненькай палоскай з рэштказ норы, што засталіся пры прыгатаванні ролаў. Гатова!

### «Ядзім» вачыма

У Японіі сушы прынята падаваць на фарфоравых талерках ці на драўляным лакіраваным посудзе, а есці — у першую чаргу вачыма, таму пялёсткі марынаванага імбіру выкладваем у выглядзе кветкі, васабі выціскаем з кандытарскага шпрыца, каб таксама атрымалася фігурна, прычым на палавінку скрыліка лімона, які будзе нагадваць сонца (сімвал Японіі), ды і самі ролы выкладваем маляўніча — скажам, можна зрабіць з іх пірамідку. Дэкарыраваць страву можна самімі інгрэдыентамі, у нашым выпадку — цудоўна будуць глядзецца сям-там выкладзеныя ікрынкі *(фота 2)*.




Галоўная ўмова — з'есці сушы адразу, пакуль іх тэмпература адпавядае нашай уласнай тэмпературы, і ні ў якім разе нельга пакідаць іх у халадзільніку да прыходу гасцей.

— Пакаштаваць сушы не адразу пасля прыгатавання — усё роўна што есці астылы стэйк! — шчыра абураецца наш повар.

Таму для прафесійных павароў ёсць «нарматывы» па прыгатаванні сушы (тры хвіліны — для рола, што рыхтавалі мы з вамі, сем хвілін — для больш складанага рола — «навыварат»), аднак вам пакуль не трэба спяшацца.

Гатовыя сушы, перад тым як пакласці ў рот, варта злёгку абмакваць у соевы соус (ён тут выконвае функцыю звычайнай солі, бо ні адзін з прадуктаў, за выключэннем рысу (які прыпраўляецца воцатам з дабаўленнем солі і цукру) падчас прыгатавання не соліцца, а не «купаць» іх там па паўгадзіны. Лёгкі, порысты рыс, які мы так стараліся не прыціскаць і не трамбаваць, імгненна ўсмоктвае соус.

Васабі трэба размешваць у соевым соусе на свой густ. Імбір варта ўжываць паміж роламі для таго, каб смак розных ролаў не блытаўся — эфект, падобны на той, што аказвае кава пры ўспрыманні паху розных парфумерных сродкаў.

Што да напояў, то лепш за ўсё падаваць сушы з сакэ (традыцыйны для Японіі моцны рысавы напой), аднак як і любую іншую рыбную страву, сушы можна смела спалучаць з белым сухім віном і нават півам. З безалкагольных напояў падыдзе язмінавая гарбата.

А апошняя парада нашага повара: у час гатоўкі не трэба засяроджвацца на тым, як бы гэта ні ў чым не памыліцца і прыгатаваць як мага хутчэй і як мага акуратней, думайце лепш пра сваю любімую жанчыну — сушы атрымаюцца смачнейшымі.

**Ала МАЧАЛАВА.**
**Фота Вольгі ЛАСКІ.**

## Абзац

◆ **Змяя знойдзена ў дзіцячым сацыяльным прытулку ў Светлагорскім раёне. Група супрацоўнікаў МНС, якая прыехала па экстраным выкліку, знайшла ў туалеце дзіцячага прытулку змяю, у якой апазнала вужа. Паўзуна выпусцілі ў лес. Як тлумачаць спецыялісты, такія выпадкі могуць апошнім часам пачасціцца. Змеі ў выніку адлігі пачынаюць выходзіць са спячкі, а з-за наступнага пахаладання зноў шукаюць сховішча. Падмурак дома са шчылінамі і выбоінамі — вельмі падыходзячае месца для таго, каб перачакаць халады. Асабліва часта ў дамы пранікаюць вужы. Не трэба спрабаваць злавіць паўзуна самастойна, у дом можа пранікнуць і гадзюка.**

◆ Двум пасажырскім самалётам у чацвер цудам удалося пазбегнуць сутыкнення ў паветры непадалёк ад Пітсбурга (штат Пенсільванія), калі наземны дыспетчар-стажор накіраваў адзін з іх насустрач другому. Як паведамілі прэсе прадстаўнікі Федэральнага авіяцыйнага ўпраўлення ЗША, трагедыі ўдалося пазбегнуць дзякуючы спрацаваўшай сістэме апавяшчэння аб лабавым сутыкненні, якое магло адбыцца, і хуткай рэакцыі пілотаў. Адзін самалёт з 57 пасажырамі на борце нырнуў уніз, а пілот сустрэчнага лайнера з 70 пасажырамі змог хутка набраць вышыню.

## Поўны абзац

◆ **Амаль дэтэктыўная гісторыя адбылася ў адным з гарадоў Днепрапятроўскай вобласці. Малады чалавек прыехаў у горад пабачыцца з сябрамі і каханай дзяўчынай, але сустрэча не адбылася. У адчаі юнак пайшоў на чыгуначную станцыю «Крывы Рог-галоўны», каб вярнуцца дамоў, у родны Мелітопаль. Але і тут не пашанцавала — апошні цягнік ужо адышоў. Тады ўкраінец вырашыў дабірацца да дому пешшу, а гэта амаль 400 км. Планы юнака рэзка змяніліся, калі ён убачыў лакаматыў, які адзінока стаяў. Менавіта на ім «герой» і задумаў даехаць да Мелітопаля, у родным горадзе ён працаваў памочнікам машыніста. З веданнем справы хлопец звязаўся з дыспетчарам і яму далі дабро на выезд. Аднак работнікі чыгункі звярнулі ўвагу, што лакаматывам кіруе замест двух, машыніста і памочніка, адзін чалавек. Гэта выклікала ў чыгуначнікаў падазрэнне, і яны пачалі тармазіць паравоз. На гэты раз хлопцу не пашанцавала ўсур'ёз — яго затрымалі работнікі міліцыі.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*



# Рукі пяшчотныя, рукі гаючыя...

Не злічыць, колькі цёплых слоў удзячнасці чуюць у свой адрас медыкі санаторыя «Пралескі», які належыць вядомаму далёка за межамі Беларусі акцыянернаму таварыству «Краснасельскбудматэрыялы». У гэтай установе працуюць вопытныя ўрачы, медсёстры, санітаркі. Жанчыны складаюць абсалютную большасць медперсаналу, і гэта зразумела, бо ў каго ж яшчэ такія пяшчотныя, такія гаючыя рукі!

«Капсула маладосці» — так завецца абсталяванне, якое нядаўна ўкаранёна ў аздараўленчы працэс санаторыя. Гэтай сучаснай устаноўкай, якая аказвае вялікі лячэбны эфект пры розных захворваннях, кіруе медсястра Алена Сцэцэвіч.

Медсястра Алена Сталярцова раіць усім адпачываючым часцей наведваць летні сад санаторыя, дзе ўвесь год квітнеюць кветкі, спяваюць птушкі.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**

# Жоўтыя кветкі — не абавязкова да разлукі

**Многія прымхлівыя кавалеры баяцца дарыць жоўтыя кветкі на свята сваім дамам, лічачы іх вестунамі разлукі. Але гэта не заўсёды так. Такую думку выказала кіраўнік клуба кветкаводаў Беларусі Святлана Глазкова.**

Яна адзначыла, што жоўты колер стварае адчуванне цяпла, мяккасці, прыносіць пачуццё радасці. Напрыклад, жоўтыя цюльпаны на мове кветак гавораць: «Твая ўсмешка, як сонечнае святло!», а жоўтыя ружы наадварот паведамляюць аб згасанні кахання і рэўнасці, жоўтыя хрызантэмы і гваздзікі — аб раскаянні. Сёння жоўты нарцыс, які лічыцца кветкай сакавіка, сімвалізуе адраджэнне, прызнанне новага часу, які прыходзіць з вясной, хоць старажытныя грэкі атаясамлівалі яго са смерцю. Яшчэ адно значэнне гэтай кветкі — каханне без адказу, моцнае пачуццё і рыцарства.

Кветкавыя салоны і кіёскі да свята Восьмага сакавіка прапаноўваюць шырокі асартымент кветкавай прадукцыі. Найбольшай папулярнасцю ў пакупнікоў карыстаюцца цюльпаны, ружы, фрэзіі, падснежнікі, мімоза. І суразмоўца патлумачыла некаторыя іх значэнні. Напрыклад, падснежнікі гавораць аб надзеі на ўзаемнасць і пяшчотнасці, мімоза азначае чуллівасць, сарамлівасць, боязь раскрыць свае пачуцці, фрэзія — давер. Таксама часта менавіта 8 Сакавіка жанчынам дораць рамонкі (юнацтва, цнатлівасць) і ліліі (чысціня, нявіннасць).

Больш за ўсё вядома пра мову ружаў і цюльпанаў розных відаў і колераў. Цюльпан — сімвал чыстага кахання, вялікага шчасця, славы, гордасці. Чырвоны колер у гэтых кветак як бы просіць: «Павер мне!», стракаты — «Якія ў цябе цудоўныя вочы». Ружы з'яўляюцца эмблемай кахання. Пунсовыя ружы сімвалізуюць свежасць, ружовыя — грацыёзнасць і элегантнасць, крывава-чырвоныя — задавальненне і боль, белыя гавораць: «Я цябе цаню». Чырвоныя і белыя ў адным букеце значаць адзінства.

**БЕЛТА.**

# Прыляцела каханне



Фота БЕЛТА.

# *Як мінімум за год*
# ВЫЙСЦІ ЗАМУЖ ЗА... ХАЛАСЦЯКА?

## Восем памылак жанчын, якія няўдала ўзялі шлюб з халасцякамі. І, адпаведна, восем правераных рэальных парад выпраўлення «крытычнай сітуацыі»

**Хутка 8 Сакавіка. Шчыра вас са святам, паважаныя жанчыны! Вы — наша радасць, асалода, натхненне, таму яшчэ плюс 8 тысяч самых цёплых слоў у ваш адрас. Добра, калі жанчыны гэты дзень сустрэнуць разам з мужамі, сынамі, дочкамі. Безумоўна, калі ўсе разам сваёй сям'ёй прыйдзеце ў госці да бацькоў, альбо наадварот, мы да вас, таксама цудоўна будзе!**

**Многія 8 Сакавіка адзначаць з каханымі мужчынамі, грамадзянскімі мужамі. А калі каханыя мужчыны, якія не ў шлюбе, сустракаюцца з жанчынамі паралельна доўгі час можна спрабаваць іх ажаніць на сабе. Як? Не вельмі проста. Але магчыма! Мінімум 8 адпаведных парад наконт гэтага вы зараз атрымаеце.**

**У якасці экспертаў парады далі самі нашы жанчыны, халасцякі, псіхолагі.**

*«Халасцяк — гэта такі чалавек, у якога ёсць усё для сямейнага шчасця, і таму ён не жэніцца»*

### 1-я (тыповая жаночая) памылка: «Калі мы ўжо пойдзем у ЗАГС?»

Не трэба ніколі гаварыць пра ЗАГС халасцяку! Гэта для яго, як вольным рыбкам у моры сказаць пра акварыум. Чым часцей вы робіце гэта, тым меншая магчымасць «ажыццяўлення мары». Праверана на практыцы віцебскімі халасцякамі: Ніхто з іх «не пацерпіць» такога «ўльтыматуму» з боку жанчын.

### Памылка № 2: «Вось, я Твая і ёсць»

Мо і так?! Але калі Ты — ягоная, сам можа прапанаваць сябе... у якасці мужа. Калі знайшоў «сваё», дык не захоча страчваць?! А наогул навошта, Табе — прыгажуні, разумніцы «прапаноўваць сябе» нейкаму мужыку? Хай сам актывізуецца і не забывае, што акрамя яго былі, ёсць (будуць) іншыя прэтэндэнты.

### Памылка № 3:»Ты — такі, што і іншы не патрэбны!

На віцебскім электронным форуме на пытанне «Як часта вы здраджваеце свайму партнёру?» крыху больш за 40 працэнтаў жанчын адзначылі, што ніколі не здраджвалі (некалькі разоў у год — пад 21 працэнт). Вядома ж, сур'ёзна да гэтых лічбаў ставіцца не трэба. Праверaная думка халасцякоў са стажам: няўжо сапраўды здраджваць не будзе? (Напэўна, што робяць самі, таго «чакаюць» і ад жанчын.) Напэўна, лепш, каб ён не расслабляўся — памятаў, што і ў вас ёсць вельмі багаты выбар.

**ДА ВЕДАМА ХАЛАСЦЯКОЎ.**

◆ **У выніку навуковых даследаванняў высветлілася, што памерці ва ўзросце да 50 гадоў у вас большасць шанцаў, чым у тых, хто жаніўся.**

◆ **Пры гэтым удаўцы могуць памерці раней, чым жанатыя.**

◆ **Не трэба праводзіць спецыяльных расследаванняў, каб высветліць, што многія халасцякі, якія жывуць без бацькоў, лепш самастойна вядуць хатнія справы, чым жанатыя (хоць, безумоўна, усё залежыць ад асобы халасцяка), так што маеце права ганарыцца гэтым?..**

◆ **Халасцякі часцей хварэюць венерычнымі захворваннямі: за сэксуальную свабоду трэба плаціць?**

### 4-я памылка: «Ён не хоча дзяцей!»

Менавіта так разважаюць жанчыны пра чарговых халасцякоў, якія сустрэліся ім на жыццёвай дарозе. Пераважная большасць — хочуць! Проста не гавораць пра гэта. Баяцца адказнасці. Многія хацелі б быць бацькам «выхаднога дня» — і халасты, і дзіця ёсць.

### 5-я памылка:» «Ды ён ніколі не жэніцца!»

Жэніцца! Калі не на вас, дык на іншай. Сярод маіх асабістых знаёмых такі ёсць (яму пад 30). Чаму ажаніўся і цяпер разумна не можа растлумачыць. Гаворыць, што «проста надакучыла шукаць сваю мару»... Між іншым, пазнаёміліся на семінары па агульных інтарэсах — менавіта ў такіх выпадках жанчынам лягчэй на «паляванні».

### Памылка № 6: Усё роўна сябры, піва, машына яму больш цікавыя!»

Што датычыцца сяброў, піва і гэтак далей, паверце на слова, халасцяку ўсё гэта так надакучыла...

Самы канкрэтная парада: калі трэба, выпіце з ім піва, і пра машыны пагаварыце (лепш за ўсё, калі ў вас ёсць уласнае аўто). Урэшце ён зможа міжволі ганарыцца перад сябрамі: калі што, «яна і дадому давезці зможа».

### 7-я памылка: «Халасцякі — усе эгаісты».

Калі лічыць эгаістамі халасцякоў, напэўна, хай і застаюцца такімі? Навошта жанчынам патрэбныя такія мужчыны? Хай і з мільёнамі долараў у кішэні — як адзін з вядомых расійскіх бізнэсменаў, які «шырока» адпачываў на славутым замежнымі курорце.

### 8- я памылка: «Ён — матулін сынок, альбо бабнік!»

Псіхолаг Уладзіслаў Быхоўскі ўпэўнены, што такі жаночы псіхалагічны падыход не вельмі абгрунтаваны. У яго практыцы былі ўжо даўно жанатыя мужчыны, на якіх жанчыны скардзіліся, што іх палovы, як дзеці: «Моцнымі павінны быць, а на справе — наадварот».

— Калі жанчыны ў такіх выпадках выходзілі замуж, няўжо не ведалі за каго? — расказвае Уладзімір Дзмітрыевіч. — Калі жанчына ў шлюбе выбірае «ролю маці», адпаведна, сынам і будзе яе каханы. Якія тут могуць быць яшчэ каментары? Пры гэтым не трэба забываць пра статыстыку, што сведчыць пра наступнае: большасць халасцякоў выхоўваліся ў няпоўных сем'ях.

Халасцяк — бабнік! Сам статус дапамагае ім заставацца такім. Лепш бабнікам, чым імп...

І ў гонар свята парада, як пазбегнуць **9- й вельмі важнай памылкі: Каб знаёмыя знайшлі халасцяка!**

Часта адзінокай жанчыне яе знаёмыя шукаюць патэнцыйнага мужа. Наўрад ці з гэтага атрымаецца нешта добрае. Пагадзіцеся, што тыя, хто ў шлюбе не першы год, не могуць «паставіць сябе на месца» адзінокіх людзей.

Паралельная памылка: калі мужу і жонцы здаецца, што «прэтэндэнт», на іх погляд, можа падыйсці іх адзінокай сяброўцы, зусім не значыць, што так яно і будзе. А калі ў самой сям'і часта ладу няма, і халасцяк гэта перыядычна можа бачыць у гасцях (як і незамужняя сяброўка сям'і), ой, навошта ім такая перспектыва? Безумоўна, знаёмых адзінокіх людзей мы будзем «прэзентаваць» як самых-самых. Суб'ектыўны погляд, які навошта навязваць «шукальнікам шчасця»?

Тэлепраграма «Тры халасцякі», бадай, упершыню ў нашай краіне адкрыта закранула тэму запатрабаванасці халасцякоў. Праўда, многія знаёмыя жанчыны проста абураліся фактам таго, што «самцы адкрыта перад камерамі выбіраюць сабе жанчын».

Шчыра буду рады, калі на працягу мінімум года, да 8 сакавіка 2009-га нешта добрае ў паляванні на халасцякоў атрымаецца. Чакаю запрашэння на вяселле!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Традыцыі
## ДУХОЎНАЯ ВЯСНА

У панядзелак для праваслаўных вернікаў пачынаецца Вялікі пост. Яшчэ гэты перыяд называюць Вялікая Чатырохдзесятніца — у памяць пра 40-дзённы пост Ісуса Хрыста ў пустыні. Вялікі пост доўжыцца 7 тыдняў. У гэты час не ўжываецца скаромная ежа (мяса, яйкі і малочныя прадукты), таксама і рыба. Згодна з Царкоўным Уставам, у будзённыя дні ежа ўжываецца без алею. У суботнія, нядзельныя дні, у дні памяці першага і другога аднойдзення галавы Іаана Прадцечы (9 сакавіка) і сарака пакутнікаў (22 сакавіка), у дзень чытання Вялікага канона (10 красавіка), у чацвер Страснога тыдня (24 красавіка) дазваляецца алей і віно. У святы Благавешчання і Вербную нядзелю дазваляецца ўжыванне рыбы, а ў Лазараву суботу (19 красавіка) — рыбнай ікры. Самыя строгія дні, калі набожныя людзі ўвогуле ўтрымліваюцца ад ежы, — панядзелак і аўторак першага тыдня (да завяршэння ў сераду літургіі) і пятніца Страснога тыдня. Для цяжарных жанчын, кормячых маці і хворых пост можа быць паслаблены альбо адменены. Подзвіг посту трэба прымаць з разважаннем, улічваючы стан здароўя, вопыт устрымання, абставіны жыцця, і трэба раіцца са святарамі.

Але памылкова думаць, што ўстрыманне ў ежы — галоўнае ў Вялікім посце. «Духоўная вясна — вось яшчэ адна назва Вялікай Чатырохдзесятніцы, — кажа благачынны Свята-Елісееўскага манастыра іераманах Яўсевій (Цюхлоў). — Як прырода ў гэтыя дні абуджаецца ад зімовага сну, так і чалавек з дапамогай усіх сродкаў, якія прапаноўвае пост: утрыманне не толькі ў ежы, але і ў раздражненні, крыўдах, страсцях і слабасцях, у павелічэнні малітвы, у чытанні духоўнай літаратуры, у споведзі, — аднаўляецца, нараджаецца духоўна». Першым крокам да Вялікага посту з'яўляецца Даравальная нядзеля, калі, паводле Царкоўнага звычая, усе людзі просяць адзін у аднаго даравання.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Лёсы

# АПОШНЯЯ СА ЖДАНКОЎ

## У лясной камянецкай вёсачцы засталася адна жыхарка

**Вярнуўшыся з камандзіроўкі, увесь вечар думала пра Марыю Аляксееўну. А ноччу, калі ўся сям'я спала, я, выключаючы святло апошняй лямпы, асабліва яскрава ўявіла: адзінокі агеньчык у цёмнай вёсцы сярод лясоў і балот. Як можна жыць адной жанчыне ў вёсцы, чалавеку з вялікага горада ўсвядоміць нялёгка.**

А яна жыве. Бабуля Марыя сустрэла нас такой прыветнай усмешкай: «Я прывыкла, а мне ў сваёй хацінцы найлепей. Чакаю вясну, вясной суседзі прыедуць амаль на ўсё лета, а ў другую хату будуць прыязджаць на выхадныя». Гаспадыня вядзе нас цераз старанна прыбраны і вымецены дворык у хату. Па дарозе паспявае звярнуць увагу на тое, што пупышкі маленькіх кусцікаў бэзу набрынялі, значыць, цяпло — недалёка. У пакоі, як і ў двары адзінай жыхаркі Жданкоў, чысценька прыбрана. Каля печы ляжыць бярэма дроў. А ад шафы да стала ўся падлога застаўлена гаршкамі, збанкамі, бляшанкамі з хатнімі кветкамі. Некаторыя цвітуць. Марыя Аляксееўна вельмі любіць разводзіць кветкі, наогул любіць расліны. Вясной і летам даглядае свой агародчык, дзе растуць бульба, буракі, морква, цыбуля. Ёсць і градка клубніц. «Агарод — цяпер уся мая гаспадарка, — расказвае бабуля Марыя. — Жыўнасць трымаць ужо цяжка. Раней куры былі, добра сваё яечка мець. Але каршуны не даюць». Аказваецца, тут, пасярод лясоў, драпежнай птушкі так многа, што з бабулінай курынай чародкай яны распраўляліся за два дні, таму гадаваць курэй страціла сэнс.

Так і пражыла ўсё жыццё Марыя Аляксееўна Клюка ў гэтай вёсцы, у гэтай хаце, якую пабудавалі яшчэ яе бацькі. Адна-аднюткая на ўсім свеце. Быў у яе брат, але памёр вельмі маладым ад хваробы. Бацькоў дагледзела. А пяць гадоў таму памерла апошняя аднавяскоўка. З той пары — адна ў вёсцы. «Добра жыву, — кажа апошняя жыхарка Жданкоў. — Мне людзі дапамагаюць і Бог памагае». Людзі — гэта сацыяльны работнік Лідзія Жук і Вольга Клюка, жыхаркі суседняй вёскі Вугляны.

Лідзію Іванаўну мы засталі ў яе падапечнай. Сацыяльны работнік прынесла бабульцы прадукты і лякарствы. Лідзія Жук расказала, што ўладкоўвацца на работу ў сацыяльную службу яна не збіралася, але зрабіла гэта, хутчэй, з-за свайго хрысціянскага абавязку. Жыла і працавала ў горадзе, а пасля выхаду на пенсію вярнулася ў бацькоўскую хату, развяла вялікую гаспадарку. Сумаваць часу не хапае, у дадатковым заробку няма патрэбы. Але некалі бацькі Лідзіі добра ведалі, паважалі Марыю Клюка, вось і згадзілася апякаць яе старасць.

— Бабулька, дзякаваць Богу, на сваіх нагах, яна і згатуе сабе, і печку прапаліць. Калі раз на тыдзень прыйду з прадуктамі і ўсім неабходным, а калі і два разы на дзень прыбягаю. Здараецца, ранкам пабуду, усё ў парадку, як быццам. А ўвечары тэлефон не адказвае: нагу закідваю на веласіпед і цісну на педалі. А гаспадынька мая, акажацца, так запрацуецца ў агародчыку, што і ў хату не заходзіць, тэлефон не чуе.



Ды і бабулька ўспрымае Ліду не як сацыяльнага работніка, а амаль як роднага чалавека. Ужо некалькі зім на час самых халадоў Ліда забірала Марыю Аляксееўну да сябе. А цяпер патрэбы такой не было, бо ні халадоў, ні завей не здарылася. Другі найбліжэйшы чалавек жыхаркі Жданкоў — яе крыху маладзейшая сяброўка і цёзка па прозвішчы Вольга Клюка. З Вольгай Іванаўнай яны калі не бачацца, то гавораць па тэлефоне кожны дзень. Разам ездзяць у царкву. Да храма трэба дабірацца восем кіламетраў. Вольгу Іванаўну падвозяць дзеці, заязджаюць і па бабулю Марыю. А цяпер найвялікшае свята для яе — выбрацца ў царкву і адстаяць усю службу.

Калі мы са старшынёй Камянецкага раённага Савета Нінай Стасюк збіраліся да Марыі Клюка, удакладнялі, як лепей праехаць, старшыня Рэчыцкага сельскага Савета Наталля Шосцік сказала: «Марыя Аляксееўна — харошы чалавек, светлы». У гэтым мы і ўпэўніліся. Апошняя жыхарка вёскі ні на што не паскардзілася, не загаварыла пра адзіноту, сум, цяжкасці. Наадварот, расказвала, што ўсё ў яе ёсць, гаварыла, як узрадавалася, калі ў мінулым месяцы да яе звычайнай пенсіі ў 162 тысячы прыслалі нейкую дапамогу ў памеры 60 тысяч рублёў. Потым у сельсавеце патлумачылі, што гэта была разавая матэрыяльная дапамога, а цяпер дакументы афармляюць на налічэнне адраснай дапамогі. А калі сталі рыхтаваць патрэбныя паперы, то высветлілася, што жыхарка Жданкоў ні разу не карысталася правам на бясплатныя лекі, хоць мае другую групу інваліднасці. Такі яна чалавек, што нічога ніколі не прасіла. Яна лічыць: усё, што чалавеку трэба, Бог дасць. У пацвярджэнне таму, што ўсё ў яе ёсць, бабуля паказвае рады са слоікамі гуркоў і іншымі хатнімі нарыхтоўкамі: «Вось з Лідай накаталі, то і не паем за зіму».

З нагоды прыезду гасцей бабулька апранулася ў выхадныя спадніцу і кофту, завязала новую хусцінку. Тэлевізар ёсць, халадзільнік ёсць, тэлефон ёсць. Гаспадыня адкідвае пакрывала, якім быў завешаны экран, бярэ пульт і ўключае новенькі «Гарызонт», у хату ўрываецца сцэна яскравага бразільскага ці нейкага іншага серыяла, бабулька «гартае» каналы і тлумачыць: «Летась купіла, стары ўжо выйшаў са строю. Цяпер уключу каляровы, — поўная хата людзей, гоман! Хіба ж мне будзе сумна?». Мы з Нінай Данілаўнай пераглядваемся, разумеючы адна адну: гэта ж колькі часу трэба было адкладваць грошы, у чым сабе адмаўляць, каб купіць новы сучасны тэлевізар з такой пенсіі!?

— Даўнішнія людзі прывыклі так жыць, з самым неабходным, — пафіласофску разважае жанчына. — Самая вялікая ласка Божая, калі спакойна, калі вайны няма.

— А вы памятаеце вайну?

— Помню, дзеткі, добра помню. Страшна тут было, зямлянкі капалі ў лесе, у іх сядзелі (у 1944 годзе пад Камянцом ішлі вельмі жорсткія баі. — **С.Я.**). Кожная сям'я з вёскі выкапала свой схрон, там жа хавалі хатнюю жывёлу. Аднойчы абстрэлы пачаліся знянацку, мы не паспелі забегчы ў лес, хаваліся ў склепе. А ў зямлянку трапіў снарад, падсвінка нашага на кавалкі разнесла. Памятаю, як бацька сказаў: «Там маглі быць мы».

Цяпер засталося шэсць хат і апошняя жыхарка вёскі. На развітанне бабуля Марыя запрасіла нас на свой юбілей, у кастрычніку ёй споўніцца восемдзесят. А сфатаграфавацца яна вельмі хацела са сваёй кошачкай. Ды колькі ні клікала, Мурка не з'явілася, відаць, падалася недзе па сваіх кашачых справах. Вясна ж ідзе. А значыць, прыйдзе яна ў Жданкі, расквітнее агарод адзінай жыхаркі, наедуць дачнікі ў суседнія хаты. Жывуць Жданкі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*Камянецкі раён.*

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

7 САКАВІКА 2008 г. ПЯТНІЦА № 10 (15514)

# ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Каралева спорту

Аляксандра ГЕРАСІМЕНЯ:

# НЯДАЎНА МНЕ ПАДАРЫЛІ 50 ПУНСОВЫХ РУЖАЎ.

## *Хто зрабіў такі падарунак, спартсменка дагэтуль не ведае*

**Што і казаць, плаванне — няпросты від спорту. Змучаны ў свой час інтрыгамі паміж спартсменамі і трэнерамі, скандаламі вакол пасады галоўнага трэнера і зменамі грамадзянства вядучымі спартсменкамі, ён, хочацца спадзявацца, пакінуў гэтыя непрыемнасці ў мінулым. Аляксандра Герасіменя, якая перажыла яшчэ і дыскваліфікацыю, застаецца самай перспектыўнай беларускай плыўчыхай. Наколькі проста аднойчы я сустрэла яе ў горадзе, настолькі няпроста нам удалося знайсці час для інтэрв'ю, бо каманда рыхтуецца да Алімпійскіх гульняў на загадкавай базе ў Бабруйску. У графік занятасці я ўпісалася падчас сняданку Аляксандры перад ранішняй трэніроўкай, калі на дзень яна прыехала ў Мінск.**



**— Не надакучыла яшчэ ў Бабруйску?**

— У нас у рэспубліцы гэта адзіная база, дзе можна трэніравацца. Што патрэбна для трэніровак? Добрая спартыўная зала, басейн і адпачынак. Калі ездзіць, скажам, у сталічны басейн ва Уруччы два разы ў дзень, то атрымліваецца матанне па горадзе. Вельмі стамляешся. А ў Бабруйску мы жывём у лесе, басейн у дзвюх хвілінах хады, сталоўка — усё на месцы.

**— Нявесела, напэўна, увесь час жыць у лесе?**

— Вядома ж, надакучвае. Але выратоўвала тое, што ў нас была там цэлая каманда, чалавек 12, было неяк весялей. А вось зараз мы едзем учацвярых ... Застаецца чакаць, калі ў другой палове года гэтыя зборы скончацца і пачнецца непасрэдна перадалімпійская падрыхтоўка. Паедзем на адкрытую ваду ці ў горы — ва Украіну ці ў Расію. Увогуле плануецца шмат паездак.

**— Ты досыць часта даеш інтэрв'ю. Журналісты не крыўдзілі?**

— Калі гаварыць увогуле, я маю на ўвазе тое, што даводзіцца чытаць пра плаванне, кожны піша тое, што ён думае, а не тое, што ёсць насамрэч. Часам гэта раздражняе. А асабіста да мяне негатыўных пасланняў не было. Увогуле гэта маё ўсяго другое інтэрв'ю за апошні час. Звычайна бывае так: калі прыязджаеш з нейкіх спаборніцтваў, дзе нядрэнна выступіў — адразу журналісты накідваюцца. Тады крыху складана, бо трэніровачны працэс у нас працягваецца, і трэба неяк усё паспець. Вось цяпер прыехала ў Мінск усяго на два дні, знаёмых пакуль праведаеш — ужо паўдня пройдзе. А яшчэ і трэніравацца трэба.

**— Няўжо нельга прапусціць ніводнага дня?**

— Вось зараз вярталіся са спаборніцтваў, у нас цэлы дзень пайшоў на дарогу. Яшчэ адзін дзень прасачкаваць нельга.

**— Што за спаборніцтвы?**

— Адкрыты Кубак Францыі. Перад «Еўропай» гэта невялікая прастартоўка. Выступілі нядрэнна, хоць заўсёды хочацца лепш. У мяне два першыя, адно другое месца.

**— Я ўдакладніла б: выступілі выдатна. Наколькі важна для цябе занятае месца?**

— Там былі не ўсе вядучыя спартсмены, не вельмі адметныя вынікі паказаны. На такога ўзроўню спаборніцтвах не важна, выйграў ты ці не, мае значэнне з якім вынікам. Дапусцім, на тым жа «палцінніку» на спіне ў мяне быў не вельмі добры вынік, і мне ўсё роўна было, якая я — першая ці дзесятая. Я была першая, але канкурэнцыі ў гэтай дысцыпліне не было. А калі «кролем» я выйграла некалькі сотых, натуральна, было прыемна, што ўсё ж такі ўрвала першае месца.

**— Як там нашы француженкі Алена Попчанка і Аня Шчэрба?**

— Іх пабачыць не ўдалося, яны выступалі на іншых спаборніцтвах. Алена і цяпер адна з лепшых плыўчых у свеце, мне да яе вынікаў працаваць і працаваць.

**— Алена старэйшая, у цябе яшчэ ёсць час яе дагнаць і перагнаць.**

— Узрост не адыгрывае амаль ніякай ролі ў плаванні. У нас ёсць 15-гадовыя спартсменкі, якія плывуць так, што мама дарагая. І на Алімпіядзе будзе шмат маладых спартсменаў, магчыма, нават і невядомых. Вось нядаўна, я ведаю, што 15 ці 16-гадовая амерыканка ўстанавіла новы рэкорд свету.

**— Якое выйсце?**

— Працаваць і яшчэ раз працаваць.

**— Два гады таму ты выйграла конкурс «Каралева спорту». Увогуле наколькі ты публічны чалавек?**

— Удзел у конкурсе адцягнуў мяне ад таго перыяду, калі ў мяне была дыскваліфікацыя, гэта дапамагло крыху развеяцца. Некалькі месяцаў тады я ўвогуле не плавала. Мне патрэбны быў такі адцягвальны сродак. А ўвогуле я не аматар фуршэтаў, свецкіх тусовак. Лепш сустрэцца з сябрамі ў кавярні, пасядзець... Люблю хадзіць у госці, плюхнуцца на канапу і размаўляць.

**— З півам?**

— Піва я не люблю. Пры нашым ладзе жыцця алкаголь, вядома ж, не вітаецца. Толькі пры вялікіх псіхалагічных нагрузках можна дазволіць бакальчык віна. Я не аматар моцных напояў. Кактэйль магу выпіць з сябрамі ў клубе. Але гэта бывае рэдка — мы і ў Мінску бываем не вельмі часта.

**— Пад сябрамі ты маеш на ўвазе калег па зборнай?**

— Мае сябры звязаны са спортам, але не з плаваннем. У мяне ёсць сяброўка, якая займаецца фігурным катаннем, сябар, які раней займаўся плаваннем, цяпер трэніруе, журналіст адзін...

**— На твой погляд, паміж жанчынай і мужчынам сяброўства магчымае?**

— Нядаўна якраз мы абмяркоўвалі з сяброўкай гэту тэму. Прыйшлі да высновы, што з боку жанчыны гэта можа быць самае сапраўднае шчырае сяброўства, а вось з боку мужчыны... Тут усё складаней, у любым выпадку сімпатыя мае месца.

**— Прыходзілася расчароўвацца ў людзях?**

— Безумоўна, але не скажу, што са мной гэта адбываецца часта. А ўвогуле гэта нармальна, у жыцці кожнага здараюцца такія моманты.

**— Па-ранейшаму жывеш з бацькамі?**

— Так, але сваю кватэру будую.

**— Паспрыяў кіраўнік федэрацыі плавання — міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі?**

— Тут я павінна сказаць «дзякуй» мэру Мінска Міхаілу Паўлаву. Будаваць аднапакаёвую, лічу, няма сэнсу, таму ў мяне будзе двухпакаёвая. Я жыву на Захадзе, і зусім недалёка, у Кунцаўшчыне, будзе мая новая кватэра. Раён перспектыўны, побач школа, супермаркет, месца, адным словам, мне падабаецца, адзінае, што вецер моцны і туман часта. Разбяруся з кватэрай, будзе час падумаць пра новы аўтамабіль.

**— Вядомая гісторыя пра тваю калегу па зборнай Святлану Хахлову, якую няветлівы вадзіцель пракаціў на капоце. У цябе такіх сітуацый не здаралася?**

— Таго вадзіцеля пакаралі, здаецца, нават пазбавілі вадзіцельскіх пасведчанняў. Аварый у мяне пакуль не здаралася, але розныя небяспечныя сітуацыі былі. За гэты час — у мяне ўжо тры гады ёсць машына — можна было навучыцца нармальна вадзіць. Машына старэнькая — «Нісан-прэм'ера» 93-га года. Цяпер прымушаю трэніравацца вадзіць маму і сястру — яны нядаўна здалі на правы. «Што вы баіцеся, — кажу я. — Біце машыну, галоўнае, каб самі жывымі засталіся».

**— Вядомая твая прыхільнасць да кніг, у прыватнасці Шолахава. Што цяпер чытаеш?**

— Я не пераборлівая, магу ўсё чытаць. Цяпер чытаю адну навуковую кнігу, па псіхалогіі. Пакуль у мяне маячыць сесія, такую літаратуру і буду чытаць. На зборах у асноўным і рыхтуюся да сесіі, хоць там цяжка штосьці вывучыць. Тое, што мне цікава, я з задавальненнем пачытаю, а вось калі нецікава, даводзіцца сябе прымушаць. Ды і любая справа, якая табе нецікавая, будзе цяжка давацца, вось і ўсё. У вучобе я не разумею імкнення да добрых адзнак. Не заўсёды той, хто вучыцца дрэнна, ведае менш, чым той, хто вучыцца добра. Добрая палова з таго, што вучым, ніколі ў будучым не спатрэбіцца. З іншага боку, калі ты хочаш стаць добрым спецыялістам і табе штосьці патрэбна, ты возьмеш кнігу і пачытаеш.

**— З класікаў акрамя Шолахава хто падабаецца?**

— Чаму акрамя? Ён мне і падабаецца, мне цікавы гэты перыяд. Кнігі я выбіраю пад настрой: адкрываю любую, чытаю першы абзац, два — зацікавіла, чытаю далей. У дарогу звычайна не бяру добрыя кнігі. Па-першае, шкада, па-другое, хочацца штосьці такое, што пачытаў і забыў. Шылаву, дапусцім, з дзяўчатамі купляем: адкрыў, пачытаў і выкінуў. Сур'ёзныя кнігі я чытаю падоўгу: думаеш, перачытваеш. Са школьнай праграмы я перачытала ўсё, акрамя «Вайны і міру». Я як убачыла дзве таўсценныя кнігі, адразу сказала, што не змагу гэта прачытаць. Калі б былі чатыры тоненькія, я лёгка прачытала б. Хоць не люблю кнігі пра вайну з падрабязным апісаннем баявых дзеянняў. Па гэтай прычыне «Ціхі Дон» спачатку мне цяжкавата даваўся. Але сюжэт займальны. «Чалавек, які смяецца» мне таксама падабаецца. Але я таксама вельмі доўга чытала.

**— Гатаваць любіш?**

— Люблю, але, на жаль, апошнім часам мне гэта рэдка ўдаецца. Хоць звычайна калі я за мяжой ці нават у нас у кавярні штосьці пакаштавала і мне спадабалася, я потым дома абавязкова паспрабую зрабіць тое ж самае.

**— Амлет такі прыгатуеш?**

— Лёгка. Я амлет гатую яшчэ лепш. Хтосьці робіць на малацэ, хтосьці на смятане, а я дадаю і смятану, і маянэз, потым зверху трэба яшчэ дзёртым сырам пасыпаць. А ўвогуле гэта мае сакрэты, больш не буду расказваць.

**— Маражанае ў такіх порцыях не забараняюць?**

— Гэта мой любімы прадукт і ніхто забараніць мне яго не можа. Праблем з вагой у мяне не было ніколі. Праўда, часам рэкамендавалі набраць. Не пытанне. Так і набіраю, толькі ўвечары ўсё гэта адбываецца — дома, седзячы на канапе...

**— ...перад тэлевізарам.**

— Я люблю музычныя тэлешоў, асабліва дзе вучацца спяваць «зоркі». Як правіла, бывае вельмі смешна, асабліва калі передача айчыннага канала. Гляджу зараз расійскую перадачу, дзе зоркі старэйшага пакалення спяваюць сучасныя песні. З задавальненнем магу паглядзець футбол, напрыклад, матчы чэмпіянату свету ці Кубка УЕФА.

**— Калі б давялося зноў выбіраць від спорту, пайшла б у плаванне?**

— Адназначна. Мне з дзяцінства падабалася плюхацца ў басейне. Калі я была ў трэцім класе, мы замест фізкультуры хадзілі ў басейн — гэта быў самы лепшы час. У дзяцінстве я яшчэ эстраднымі танцамі займалася, нас нават на падтанцоўкі запрашалі. Але я хутка зразумела, што перспектывы, акрамя «Славянскага базару», ніякай. У плаванні ж усё залежыць ад цябе. Наколькі добра ты прaплывеш, настолькі далёка і зойдзеш. Калі кінула танцы, у мяне было адчуванне, быццам у мяне штосьці адарвалі, я прыходзіла ўвечары дадому і танцавала.

**— Якія падарункі любіш атрымліваць на 8 Сакавіка?**

— Розныя. Я ўвогуле люблю падарункі. На 8 Сакавіка мне шмат хто дорыць, блізкія ў асноўным. Скажу так: важны не падарунак, а ўвага.

**— Які падарунак назвала б самым запамінальным?**

— Сёлета, 14 лютага, у дзень закаханых мне падарылі букет з 50 пунсовых і ружовых ружаў. Прывезлі прама на нашу базу ў Бабруйску. Ніякай запіскі ўнутры не аказалася. Вельмі хацелася б ведаць, хто б гэта мог быць...

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

Слухай сваё

# *Па-беларуску* ЗАСПЯВАЕ... БАБКІНА?

**Найлепшыя беларускамоўныя песні мінулага года патрапяць да слухача на адным дыску — у складзе «Прэм'ер Тузін-2007». 42 беларускамоўныя кампазіцыі былі адабраныя падчас галасавання, што адбывалася на працягу года на музычным партале «Тузін Гітоў».**

У галасаванні бралі ўдзел наведвальнікі партала (за 2007 год іх колькасць склала каля 200 000 чалавек), а таксама музычныя аналітыкі, прадстаўнікі вядомых айчынных лейблаў Віктар Гольцаў (Go-Records), Віталь Супрановіч (BMAgroup), Уладзімір Максімкаў (Vigma), Вячаслаў Гулевіч (Новая музычная кампанія), Мікалай Сапуноў (West Records).

У «залаты тузін» традыцыйна ўвайшлі новыя хіты рокавых груп «N.R.M.» (дарэчы, іх песня «Менск-Мінск» была прызнана песняй года на «Тузіне»), «Krama», «ZET», «IQ48». Некаторай нечаканасцю стаў выхад у лік «фіналістаў» блюзавай каманды «NESTARы Band», арт-фолькавай «OSIMIRA» і гурта «Band A». Паводле меркавання слухачоў, вартымі першай «дванаццаткі» сталі таямнічая каманда Пятра Елфімава «PitBull», сярэдняявечны «Рокаш», а яшчэ бярозаўскі «:B:N:», магілёўскі «Tav.Mauzer» і гомельскі «Бан-Жвірба». Другую секцыю «Прэм'ер Тузіну» (фармат mp3) склалі 30 найбольш цікавых песень з хіт-парада.

За чатыры гады працы «Тузіна Гітоў» на яго Інтэрнэт-старонках было прадстаўлена больш за 300 новых беларускіх песень. Цяперашні склад — трэцяя «песенная справаздача» партала. Музыкант Алег Хаменка падчас прэзентацыі «Прэм'ер Тузіна-2007» адзначыў, што на папярэдніх дысках агульная танальнасць кампазіцый дэпрэсіўна-пратэстная, на новым больш твораў задумліва-філасофскіх. Ёсць тут і вясёла-сцёбныя песні, як народна-каўбойская «Cok-cok-cok» ад гурта «Pete-Paff» ці злабадзённая «Крыніца цяпла» — ода газавай трубе ад «UltraВожык», ёсць рэчы надзвычай паэтычныя («Лета» А. Камоцкага, «Горад» В. Шалкевіча)... Стракатасць не толькі ў настроі, але і ў музычным кірунку, якога прытрымліваюцца выканаўцы — дамінуе «цяжкі» рок, сустракаецца рэп (СРВ), акапэльны фольк (Camerata), этнічныя напевы (Джамбібум) ды інш. Поп-выканаўцы таксама не застануцца па-за ўвагай, варта ім толькі няблага праспяваць па-беларуску — так, у склад 2005 года патрапілі «Аляксандра і Канстанцін» з песняй «Ду-ду да-да» і «J:Морс» з песняй «Глядзі», у 2006 A&K зноў спадабаліся слухачам (народнаю «А дзе была вуліца»). У гэтым годзе нішу «папулярных» займае песня Анжалікі Агурбаш «Вянок» — паводле слоў адміністратараў сайта, яна мела неблагія пазіцыі ў хіт-парадзе на працягу некалькіх тыдняў. Тое, што на галасаванне могуць выставіць сваю песню ўсе ахвотнікі, адпавядае ідэі заснавальнікаў партала — прапагандаваць айчынную беларускамоўную музыку. Дзеля гэтага «Тузін Гітоў» займеў найбуйнейшы легальны сеціўны каталог беларускамоўных песень у фармаце MP3, з якога штомесяц фіксуецца каля 50 000 скачванняў трэкаў, гэтыя песні гучаць у радыёэфіры. На сайце можна знайсці навіны з музычнага жыцця краіны, а калі дадаць сюды змешчаныя там жа каля 100 рэцэнзій на навінкі, дык атрымаецца ці не поўны жыццяпіс сучаснай айчыннай альтэрнатыўнай музыкі.

Наколькі аб'ектыўнымі сталі вынікі галасавання, вы можаце ўпэўніцца самі — «Прэм'ер Тузін-2007» ужо ў продажы. Арганізатары ТГ прызнаюцца — нягледзячы на існаванне адмысловых механізмаў забеспячэння добрасумленнага галасавання, без парушэнняў не абыходзіцца ні дня. Існуюць нават спісы самых актыўных аматараў прагаласаваць за адну песню больш як раз на суткі.

Аналізуючы развіццё беларускамоўнай музыкі за апошнія гады, Алег Хаменка па нашай просьбе паспрабаваў спрагназаваць яе будучыню. На яго думку, актыўная папулярызацыя музыкі фармату ТГ прывядзе да таго, што беларускім рускамоўным музыкантам таксама захочацца спяваць на роднай мове. Прывабіць беларуская мова і выканаўцаў з суседніх краін — паводле інфармацыі спадара Хаменкі, цікаўнасць ёсць у польскіх і расійскіх камандаў, а Надзея Бабкіна нават ужо вядзе з беларусамі адпаведныя перамовы. Чым парадуе нас наступны музычны год? На «Тузіне» стартуе чарговая серыя хіт-парадаў...

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ.**

## ЭЛЕКТРОННАЯ ПРЭЗЕНТАЦЫЯ... ПЯРВІЧКІ

**Упершыню Віцебскі абласны камітэт БРСМ і Савет абласной піянерскай арганізацыі праводзяць конкурс электронных прэзентацый і відэаролікаў «Мая арганізацыя».**

У конкурсе могуць удзельнічаць усе ахвотнікі (ва ўзросце да 31 года). Журы будзе ацэньваць арыгінальнасць, дызайнерскую ідэю і інш. Члены аргкамітэта абяцаюць аўтарам, што работы пераможцаў будуць выкарыстоўвацца для прапаганды дзейнасці арганізацый з захаваннем аўтарскіх правоў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## РЭГУЛІРОЎШЧЫКІ НА ГАДЗІНУ

ДАІ пачала ў Гродне рэалізацыю чарговага праекта, накіраванага на папярэджанне здарэнняў з удзелам дзяцей-пешаходаў. На вуліцах абласнога цэнтра з'явіліся трыццаць падлеткаў, апранутых у святлоадбівальныя камізэлькі.

Так званыя «стоп-мены» закліка्ны забяспечыць бяспеку пешахода на пешаходных пераходах паблізу сваіх навучальных устаноў. Для гэтага юным памочнікам Дзяржаўтаінспекцыі дадзена права стрымліваць рух транспартных сродкаў. Пры ўзнятым угору дыску вадзіцелі абавязаны будуць спыняцца, каб прапусціць пешаходаў.

«Стоп-мены» не толькі дапамогуць дзецям пры пераходзе вуліц — школьнікі атрымаюць магчымасць выбраць найбольш бяспечныя маршруты руху. Прысутнасць на вуліцах юных рэгуліроўшчыкаў таксама дазволіць дысцыплінаваць вадзіцеляў. Першапачаткова каля пешаходных пераходаў да заняткаў і пасля будуць дзяжурыць «стоп-мены» з 15 устаноў адукацыі. У далейшым такую практыку плануецца распаўсюдзіць для ўсіх сярэдніх агульнаадукацыйных школ горада.

**Алег ДУК, старшы інспектар па прафілактыцы і прапагандзе ДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

Наш фармат

# МАЛЕНЬКАЯ БЕЛАРУСКА АДЧЫНІЛА СВАЁ «АКНО Ў ЕЎРОПУ»

*Вучаніца Святланы Стацэнка заняла 2-е месца на прэстыжным міжнародным фестывалі*

**Для 12-гадовай мінчанкі Дашы Надзінай, нягледзячы на юны ўзрост, цяперашняе дасягненне — не першае ў конкурснай дзейнасці. У 2007 годзе дзяўчынка ўжо ўдзельнічала ў Міжнародным дзіцячым конкурсе «Залатая пчолка», што праходзіць у Клімавічах, і атрымала 2-ю прэмію.**



Сёлета Даша, як і яшчэ больш за 400 юных выканаўцаў з розных краін, узяла ўдзел у Міжнародным фестывалі дзіцячай творчасці «Акно ў Еўропу» (Санкт-Пецярбург) — і зноў узяла 2-е месца. Але, паводле слоў яе педагога, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Святланы Стацэнка, гэтая прыступка дарагога каштуе.

— Падрыхтоўка да паездкі ў Санкт-Пецярбург была дастаткова сур'ёзнай, бо «Акно ў Еўропу» — вельмі прэстыжны конкурс, — расказвае Святлана Стацэнка. — Былі пашыты адмысловыя касцюмы, пастаўлена харэаграфія, прапісаны бэк-вакал, зроблены аранжыроўкі песень. І гэтая падрыхтоўка была добра бачна на сцэне — Даша прадставіла на суд журы і публікі не проста выдатнае выкананне, а паказала сапраўдныя міні-спектаклі. Пасля першага туру суддзі адсеялі 50 працэнтаў удзельнікаў, так што, я лічу, Даша дасягнула многага, заняўшы другое месца. Першае дасталася 15-гадовай масквічцы.

Паводле ўмоў конкурсу, удзельнікам у двух турах трэба было прадставіць кожнаму па тры песні. У сваёй узроставай групе — 12—15 гадоў — беларуска была самай малодшай канкурсанткай. Але ні гэта, ні ўсякія іншыя хваляванні не перашкодзілі Дашы цудоўна выканаць абраныя кампазіцыі: «Мой горад», «Паветраны змей» і «Вярба». «Вельмі важна, што педагог прыслухоўваецца да майго меркавання пры адборы песень, — падзялілася юная спявачка. — Гэта дадае ўпэўненасці ў сваіх сілах. Увогуле, на конкурсе «Акно ў Еўропу» панавала сяброўская атмасфера, я, напрыклад, пасябравала з дзяўчынкай з Кастрамской вобласці».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# МІНСКІХ ШКОЛЬНІКАЎ АБМЯРКОЎВАЛІ НА СХОДЗЕ

**Першы агульнагарадскі бацькоўскі сход прайшоў днямі ў Мінску. Дэлегаты ад бацькоўскіх саветаў, настаўнікі і прадстаўнікі ўлады сабраліся ў кіналекцыйнай зале Мінскага палаца дзяцей і моладзі ў рамках 6-й спецыялізаванай выставы «Адукацыя і кар'ера», каб абмеркаваць працэс навучання школьнікаў.**

Асноўная мэта сходу — наладзіць дыялог паміж педагагічнымі калектывамі, бацькамі ды дзяржаўнымі службамі. Падчас мерапрыемства чыноўнікі і бацькі агучылі шэраг праблемных момантаў, што звязаны са школьнай адукацыяй.

Так, аб пераводзе з наступнага навучальнага года ўсіх школ, ліцэяў і гімназій на пяцідзённы вучэбны тыдзень расказала **Валянціна МАЕЎСКАЯ, намеснік начальніка ўпраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі.** У шосты ж школьны дзень, паводле слоў Валянціны Леанідаўны, у адукацыйных установах будуць праводзіцца факультатывы, курсы па выбары, заняткі па інтарэсах, фізкультурна-аздараўленчыя і спартыўна-масавыя мерапрыемствы. Такім чынам, у школьнікаў будзе выбар: ці адпачыць у суботу ды адаспацца, ці наведаць які факультатыў. У будні ж у школьнікаў будзе па 6—7 урокаў. Паміж шостым і сёмым урокамі плануецца перапынак у 15 хвілін. Расказала Валянціна Маеўская і пра перагляд вучэбных праграм з мэтай разгрузіць школьнікаў: вучэбны матэрыял быў скарочаны на 25—30 працэнтаў з-за пераносу часткі матэрыялу з базавага ўзроўню навучання на паглыблены, а часткі — на курсы па выбары і факультатыўныя заняткі. Таксама была скарочана дазіроўка хатняга задання: сёння вучань 11—12-га класаў павінен траціць не больш за 3 гадзіны на яго выкананне.

Пра здароўе школьнікаў паведаміла **Ірына УШАКОВІЧ, начальнік аддзела лячэбна-прафілактычнай дапамогі дзецям і маці камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама.** Першае месца сярод захворванняў займаюць рэспіраторна-вірусныя інфекцыі, у сувязі з чым Ірына Рыгораўна звярнула ўвагу бацькоў на тое, што толькі адзінкі з іх займаюцца загартоўваннем дзяцей. Калі медыкі праводзілі апытанне школьнікаў, то высветлілася, што дома ніхто з іх не робіць зарадкі. А чаму? Бо бяруць прыклад з бацькоў... Другое месца займаюць разнастайныя траўмы. Трэцяе — захворванні вачэй. 10 працэнтаў дзяцей, якія прыходзяць у пачатковую школу, ужо маюць адхіленні ў органах зроку. Тут Ірына Ушакевіч адзначыла, што калі ў школе вырашаюцца пытанні асвятлення, то, на жаль, дома дзеці робяць урокі дзе прыйдзецца. Адсюль і праблемы са зрокам. На чацвёртым месцы — захворванні страўнікава-кішачнага тракта. Цікава, што яшчэ ў канцы 90-х гадоў гэтыя захворванні былі на 2-м месцы, але арганізацыя ўмоў для паўнацэннага харчавання дзяцей ва ўстановах адукацыі дазволіла знізіць гэтыя захворванні на 38 працэнтаў.

Прадоўжыла тэму здароўя **Валянціна ЖЫХАР, загадчык аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі.** Яна расказала, што медыкаў хвалюе фізічнае развіццё дзяцей. Школьнікі недастаткова бываюць на свежым паветры, недастаткова рухаюцца, большую частку свайго часу праводзяць у хатніх умовах. Праведзенае апытанне паказала, што дзеці праводзяць 2 гадзіны на вуліцы, а бывае, што і таго менш — толькі па дарозе ў школу і з яе. А па нормах жа дзеці павінны знаходзіцца на свежым паветры не менш за 4 гадзіны ў малодшых класах і не менш за 2,5—3 — у старэйшых.

Пасля выступленняў спецыялістаў пачаў працаваць так званы «інтэрактыўны форум», на якім бацькі задавалі хвалюючыя іх пытанні: пра паступленне, пра школьную форму, пра факультатывы і шмат пра што іншае...

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2008 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 31 сакавіка** ў рэдакцыю па адрасу: **220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прызоў гадзіннікі, майкі, бейсболкі, печ ЗВЧ, тэлевізар «Віцязь» і суперпрыз — халадзільнік «Атлант». Розыгрыш прызоў праводзіцца **4 красавіка 2008 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 12 красавіка**.

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 чэрвеня 2008 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2008 года і пашпарта. Дастаўку печы ЗВЧ, тэлевізара і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 чэрвеня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

**Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў нумары газеты за 1 сакавіка 2008 года. Удачы ў гульні!**

Тэрмін правядзення гульні — з 1.03.08 па 10.04.08.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 964 ад 26.02.08, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

**2 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал 2008 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ____________________
(аддзяленне сувязі)

____________________ **на II кв. 2008 года**

**Хатні адрас і тэлефон** [ ] ____________________
(індэкс)

____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ** на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2008 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму ____________________
(прозвішча, ініцыялы)

Куды ____________________
(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА** на газету

| ПВ | месца | літар |
|---|---|---|

(індэкс выдання)

**ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

| Кошт | падпіскі | ______ руб. | Колькасць камплектаў | |
|---|---|---|---|---|
| | пераадрасоўкі | ______ руб. | | |

на 2008 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму ____________________
(прозвішча, ініцыялы)

Куды ____________________
(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)




# Ёгурт «Фітнэс» — порцыя здароўя

ААТ «Рагачоўскі МКК» выпусціў унікальны кісламалочны прадукт — ёгурт «Фітнэс» без цукру, 1,5 % тлустасці. Ёгурт без цукру — гэта пяшчотны прадукт з кіслінкай, лёгка засваяльны арганізмам. Прызначаны для тых, хто хоча атрымаць асалоду ад добрага смаку і пры гэтым пазбегнуць лішніх кілаграмаў. Ёгурт змяшчае жывыя ёгуртавыя культуры, багаты бялком, кальцыем і каліем, выдатная крыніца вітаміну B, паляпшае абмен рэчываў, аднаўляе мікрафлору кішэчніка. Так як ёгурт не змяшчае вугляводаў (цукру), ён падыходзіць і для хворых на цукровы дыябет, якія прытрымліваюцца безвугляводнай дыеты.

Ёгурт можна ўжываць як самастойны прадукт, так і дабавіўшы ў мюслі, ягады або фрукты. Прадукт ідэальна падыходзіць для запраўкі салатаў. Жывы натуральны ёгурт, які не змяшчае цукру, — сапраўдны дыетычны прадукт, штодзённая порцыя здароўя!




**Адкрытае акцыянернае таварыства «Рагачоўскі малочнакансервавы камбінат»**
247671, Гомельская вобласць, г. Рагачоў, вул. Кірава, 31
**Аддзел продажаў**
тэл. (02339) 38303,
факс (02339) 27192, 27183
E-mail: marketing@rmkk.by,
www.rogmkk.narod.ru
**Гандлёвы дом «Вясковая Раніца»**
г. Мінск, тэл. (017) 2036463,
факс (017) 2036465
E-mail: minsk@rmkk.by
г. Гомель, тэл. (0232) 602615,
факс (0232) 579310
E-mail: gomel@rmkk.by
**Рэгіянальныя прадстаўнікі:**
г. Магілёў,
маб. тэл. +375 29 6599990
г. Гродна,
маб. тэл. + 375 29 6998621
УНП 400046241

## Дарагія жанчыны!

ААТ «Рагачоўскі МКК» горача і сардэчна віншуе вас з самым цудоўным святам жанчын — 8 Сакавіка!

Усё наша жыццё напоўнена цеплынёй і святлом вашага абаяння і дабрыні. Ваша падтрымка і любоў натхняюць на стварэнне і даюць сілы. Усю гісторыю чалавецтва можна было б напісаць як гісторыю пакланення жанчыне. Дзеля яе — цудоўнай і адзінай — ва ўсе часы будаваліся гарады, адкрываліся новыя зоркі, з'яўляліся на свет чароўныя творы мастацтва. І ў гэты дзень ні адно мужчынскае сэрца не можа застацца абыякавым. Бо менавіта вы — жанчыны — аберагаеце сваёй увагай, надаяце высакароднасці, з вамі звязана ўсё добрае, мілае і цудоўнае. Няхай вас не пакідаюць вера, надзея і любоў! Няхай заўсёды акружаюць цеплыня і клопат родных і блізкіх вам людзей. Жадаем вам, дарагія нашы жанчыны, добрага здароўя, выканання ўсіх вашых запаветных планаў, каб у вашых сем'ях, у вашых дамах заўсёды панавалі радасць, утульнасць і дабрабыт.

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.43 | 17.59 | 11.16 |
| Віцебск — | 6.34 | 17.48 | 11.14 |
| Магілёў — | 6.33 | 17.49 | 11.16 |
| Гомель — | 6.28 | 17.47 | 11.19 |
| Гродна — | 6.58 | 18.14 | 11.16 |
| Брэст — | 6.57 | 18.16 | 11.19 |

**Месяц**

*Маладзік 19.20.*
*Месяц у сузор'і Рыбаў.*

**Імяніны**

**Пр.** *Ірыны, Апанаса, Віктара, Івана, Іосіфа, Леаніда, Мікалая, Пятра, Уладзіміра, Фёдара*
**К.** *Пярпетуі, Феліцыты, Паўла, Тамаша.*




**...у суседзяў**

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +8..+10°C | КІЕЎ +6..+8°C | РЫГА +6..+8°C |
| ВІЛЬНЮС +6..+8°C | МАСКВА +1..+3°C | С.-ПЕЦЯРБУРГ -1..+1°C |

Шык-шок

# РЫХТУЙ БАСАНОЖКІ ВЯСНОЙ

**Што такое сэксуальныя басаножкі? Гэта яркі колер, мінімум дэталяў, зручная калодка, высокі абцас або супер-платформа, лак або скура пітона. Ва ўсякім выпадку менавіта гэта прапануюць сэксі-модніцам Barbara Bui, Versace, Jil Sander, Marni і Yves Saint Laurent.**

Наогул у вясенне-летнім сезоне дызайнеры прыдумалі шмат цікавага. Напрыклад, боты-сандаліі а-ля гладыятар і бацільёны на шпільцы з адкрытым мысам. Сама ідэя далучыць да сандаляў верх ботаў узнікла яшчэ ў мінулыя сезоны, але ў сезоне Вясна-Лета 2008 яна працягвае развівацца. Гэта могуць быць і мінімальныя варыянты, і досыць складаныя структуры: палоскі крыж-накрыж, неверагодныя выразы і зробленыя ўручную ўпрыгажэнні.

Яшчэ адзін накірунак — язычніцкія і племянныя матывы. Тут выкарыстоўваюцца грубыя, неапрацаваныя матэрыялы ў спалучэнні з незвычайнай тэхнікай. Так са звычайнай вяроўкі выконваецца гібкі, мяккі верх, а трываласці і ўпэўненасці надаюць драўляныя абцасы і падэшвы. Дадаюцца сімвалы, якія знешне нагадваюць іерогліфы.









Укараняюцца і арыгінальныя мадэлі, у якіх неверагодна высокія абцасы спалучаюцца са спартыўнымі элементамі аздаблення. Замест класічных металічных засцежак дызайнеры выкарыстоўваюць засцежкі пластмасавыя, «ліпучкі», моцную шнуроўку.



Знешне басаножкі здаюцца аб'ёмнымі за кошт стылізаваных палосак, якія даюць адчуванне ў хуткасці і зручнасці. Лёгкасць і паветрапранікальнасць абутку забяспечваюць порыстая скура і дэкаратыўныя выразы.

**Падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.**

## 7 сакавіка

**Дзве даты**



**321 год** — загадам рымскага імператара Канстанціна Вялікага нядзеля ў хрысціянскім свеце аб'яўлена выхадным днём.

**1768 год** — на тэрыторыі Рэчы Паспалітай і Вялікага княства Літоўскага ўраўнаваны ў правах каталікі і праваслаўныя.

**Цытата дня:**

***«Чым больш чалавек задаволены сабой, тым менш у яго такіх якасцяў, якімі можна было б ганарыцца».***

**Леў Талстой.**



*Мужчынская палова* Навукова-вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства "ДЫЯЛЕК" ***віншуе сваіх прыгожых, таленавітых, старанных супрацоўніц са святам 8 Сакавіка*** *і жадае ўсім любові, дабрабыту, поспехаў у любых справах! Паболей вам прыемных падарункаў і шчырых віншаванняў у гэты цудоўны дзень, дарагія нашы жанчыны!*

*Віншуем з юбілеем* **Наталлю Георгіеўну ЮРКЕВІЧ.**

*Хай спорыцца любая справа,*
*Не сустракайся ты з бядой,*
*І колькі б год ні мінавала,*
*Душа хай будзе маладой.*
**Калегі, г. Новалукомль.**

*Віншуем з днём нараджэння* ***Уладзіміра Мікалаевіча РАБОГА.*** *Жадаем моцнага здароўя на доўгія гады, удачы і поспехаў у справах, шчасця ў жыцці.*

**Жонка, сын, цешча і цесць, сям'я Піцінавых.**

В публикации ОАО «Белагропромбанка» о перечне обязательной информации, которая должна содержаться в анкетах акционеров (газета «Звязда» № 44 от 6.03.2008 г.), УНП следует читать: 100693551.

## УБАЧЫЛА СВЕТ «ПЕСНЯ НАТХНЕННЯ»

**Убачыла свет доўгачаканае ў музейным свеце выданне «Песня натхнення».**

Гэта першая кніга з серыі «З паэтычнай спадчыны Якуба Коласа», паведаміла карэспандэнту **БЕЛТА** намеснік дырэктара Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Ганна Зайцава.

Выданне падрыхтавана па ініцыятыве музея. У ім сабраны 54 лірычныя вершы Якуба Коласа, прысвечаныя блізкім жанчынам, якія пакінулі след у яго жыцці. Некаторыя з вершаў публікуюцца ўпершыню.

Кніга афармлена прыжыццёвымі партрэтнымі замалёўкамі Якуба Коласа мастака Сямёна Геруса.

## Усміхнёмся!

Фатограф доўга здымае вяселле і нарэшце абвяшчае:

— А цяпер дазвольце сфатаграфаваць самую шчаслівую пару.

Публіка ў здзіўленні: зробленыя ўжо дзесяткі здымкаў.

— Нявесту і яе маму, — тлумачыць фатограф.

☺

**У спрэчцы заўсёды апошняе слова застаецца за жанчынай. Усё, што мужчына спрабуе сказаць пасля гэтага, становіцца пачаткам новай спрэчкі.**

☺

Жонка мужу:

— Ты памятаеш — хутка 8 Сакавіка! А што ты мне падорыш?

— А што ты мне падарыла на 23 лютага?

— Я? Сваё каханне і клопат!

— Вось і я табе нічога не падару!

☺

**Не разбурайце мае нервовыя клеткі — у іх жывуць мае нервовыя тыгры!**

☺

— Што гэта ў цябе за чырвоныя плямы па ўсім целе?

— Ды вось, купіў бясшумны пыласос, цяпер не зразумею, калі ён працуе, а калі не.

☺

**— Блін! — сказаў слон, наступіўшы на калабка.**

☺

Двое турыстаў-мужчын мерзнуць у палатцы (вось ужо тыдзень як мерзнуць)

— Эх, жанчыну б сюды, ды такую гарачую!

— Т-а-а-к... ды з хрумсткай скарыначкай!

# Чароўныя хлебапёкі з Барысава

Хлеб — геніяльнае вынаходніцтва чалавецтва. У свеце шмат каштоўнасцяў, якія, як хлеб, ні на дзень, ні на гадзіну не страчвалі б свайго значэння.

Ён трывала заняў першае месца ў харчаванні чалавека дзякуючы вялікім перавагам у параўнанні з усімі іншымі прадуктамі. Харчовы рацыён чалавека пастаянна павінен утрымліваць больш як шэсцьсот рэчываў. Няма іншага прадукту харчавання людзей, акрамя хлеба, які ўтрымліваў бы іх амаль усе.

І хто з нас засумняваецца ў тым, што пах гарачага хлеба — адзін з самых лепшых у свеце. Яго не зблытаеш ні з якім іншым.

І хоць гавораць, што хлеб пахне хлебам, аднак кожнаму хлебнаму вырабу з шырокага асартыменту РУП «Барысаўхлебпрам» уласцівы свой непаўторны водар і смак, якія фарміруюцца падчас доўгага працэсу стварэння румянага караваю хлеба.

Ужо больш як 10 гадоў на заводзе ў Барысаве выпякаюць заварныя хлябы па складанай шматстадыйнай тэхналогіі з выкарыстаннем тэрмафільных заквасак. Гэта хлябы «Дымковский», «Молодецкий обычный», «Изобильный», «Триумфальный» і іншыя, якія так прыйшліся даспадобы барысаўчанам, гасцям горада, а таксама жыхарам Мінска і Мінскай вобласці.

Цяпер мы хочам расказаць аб ***навінках вытворчасці***, якія ўжо былі годна ацэнены на Рэспубліканскім аглядзе якасці-2007.

***Хлеб «Светлорощинский» з цыбуляй і хлеб «Борисовский с салом».*** Пра іх можна сказаць, што гэта ўжо гатовы бутэрброд. «Светлорощинский» з цыбуляй — хлеб заварны з грудзінкай сыравэнджанай і смажанай цыбуляй. Пах свежавыпечанага хлеба цудоўна спалучаецца з водарам грудзінкі і цыбулі. У працэсе захоўвання водар не прападае. Смак хлеба не падмане вашых чаканняў.




А ў хлебе «Борисовский с салом» сала салёнае вельмі добра спалучаецца з кменам і сушанай агароднінай і прыправамі.

Дастаткова адной лустачкі, каб спаталіць голад.

Сваю назву ***хлеб барысаўскі «Бадзёры»*** атрымаў не выпадкова. Бо гэта хлеб, абагачаны жалезам і фоліевай кіслатой. А карысныя ўласцівасці жалеза агульнавядомыя, яно неабходна людзям, якія адчуваюць фізічныя і эмацыянальныя нагрузкі, карысна будучым маці. Фоліевая кіслата стымулюе і рэгулюе кровазварот, пад яе ўплывам зніжаецца ўтрыманне халестэрыну ў сыроватцы крыві. Хлеб пасыпаюць семем гарбуза, які ўтрымлівае цынк. А цынк — гэта здаровыя валасы і пазногці, асабліва цынк карысны прадстаўнікам моцнага полу.

**РУП «Барысаўхлебпрам» заснавана ў 1972 годзе і аб'ядноўвае ў сваім складзе шэсць хлебазаводаў: Барысаўскі, Вілейскі, Жодзінскі, Маладзечанскі, Нясвіжскі, Салігорскі. Барысаўскі хлебазавод (галаўное прадпрыемства) — адзін з найбуйнейшых у Беларусі.**

***Хлеб «Облепиховый»*** — з водарам мёду і салодка-кіслым прысмакам мёду і абляпіхі. У яго склад уваходзяць мёд, канцэнтрат кваснага сусла, клятчатка Сибирская «Облепиха», якая абагачае хлеб харчовымі валокнамі, мінеральнымі рэчывамі, вітамінамі групы B, караціноідамі. Харчовыя валокны садзейнічаюць праходжанню ежы па стрававальным тракце, паляпшаюць работу кішэчніка, нармалізуюць многія працэсы абмену рэчываў, прадухіляюць развіццё шэрагу сур'ёзных захворванняў. Харчовыя валокны патрэбны для нармальнага функцыянавання не толькі стрававальнай сістэмы, але і ўсяго арганізма, і хлеб «Облепиховый» дае такую магчымасць.

***Хлеб «Исполин».*** Сама назва гаворыць, што хлеб будзе вялікі, з водарам і смачны. І гэта сапраўды так. Маса яго 1,1 кг, ён акругленай формы, пышны, з цёмнай скарыначкай. А смак і водар яго фарміруюцца дзякуючы дадатковаму ўвядзенню салодкай заваркі з мукі ржаной абдзірной, патакі і невялікай колькасці кмену. Дабаўка павідла стварае незвычайны смак, які нагадвае пра дамашні хлеб, выпечаны ў рускай печы.

Спецыялістамі вытворча-тэхналагічнай лабараторыі атрыманы патэнт на вытворчасць хлябоў на вадкай хмелевай заквасцы. Гэта складаная шматстадыйная тэхналогія вытворчасці заварных хлябоў з прымяненнем заквасак з натуральнага хмелю, без выкарыстання прасаваных дрожджэй. Аналогіі ёй няма ў Рэспубліцы Беларусь і ў СНД.

Па гэтай тэхналогіі выпрацоўваецца цяпер ***хлеб «Губернский»***, які не адзін раз заваёўваў узнагароды на розных конкурсах і дэгустацыях.

Асартымент хлябоў, якія выпрацоўваюцца на хмелевай заквасцы, без выкарыстання прасаваных дрожджэй дастаткова вялікі. Некаторыя з іх ужо прыйшліся пакупніку даспадобы. Гэта «Классический», «Борисовский хмелевой», «Губернский новый», «Ароматный бездрожжевой». А штосьці яшчэ давядзецца пакаштаваць: «Молодецкий бездрожжевой», «Триумфальный бездрожжевой», «Губернский особый» і многія іншыя.

Хмелевыя заквaскі, на якіх замешваецца цеста для гэтых хлябоў, маюць працяглую жыццядзейнасць, устойлівасць да ўздзеяння пабочнай мікрафлоры. Наяўнасць у хмелі фітанцыдаў не дазваляе развівацца цвілі і спрыяе захаванню адменных смакавых якасцяў і свежасці хлеба без упакоўкі на працягу 3 сутак, упакаванага — 6 сутак.

У чэрвені 2007 года дзяржаўнай патэнтнай экспертызай прынята Рашэнне аб выдачы прадпрыемству патэнта Рэспублікі Беларусь па заяўцы на вынаходніцтва «Спосаб прыгатавання зброджанай заваркі для вытворчасці хлеба».

Укараненне гэтай новай тэхналогіі вытворчасці бяздрожджавых хлябоў доўгага тэрміну захоўвання на кісламалочнай зброджанай заквасцы з выкарыстаннем кефірных грыбкоў дазваляе палепшыць і расшырыць асартымент хлябоў.

Хлябы «Любомирский» и «Любомирский с посыпкой» выпрацоўваецца па гэтай новай тэхналогіі.

Хлеб «Любомирский» мае тонкі водар і смак мёду, таму што ў яго склад уваходзіць мёд цукровы янтарны.

А хлеб «Любомирский с посыпкой» выпрацоўваецца з выкарыстаннем цукру, які надае мякішу саладкаваты смак, а скарыначцы — апетытны колер і водар. У якасці пасыпкі выкарыстоўваецца семя гарбуза, якое вельмі апетытна падсмажваецца ў працэсе выпечкі. Семя гарбуза ўтрымлівае цынк.

Гэта толькі малая частка прадукцыі, якую выпускае хлебазавод Барысава. Хлебапёкі Барысава з поўным правам могуць сказаць, што хлеб — гэта жыццё, а выпечка яго — сапраўднае майстэрства.

***Матэрыял да друку падрыхтавала Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ.***

## Мілыя жанчыны!

**Вялікі калектыў РУП «Барысаўхлебпрам» віншуе вас са святам вясны — 8 Сакавіка!**
**Самага вялікага вам шчасця! Здароўя, радасці і кахання! Цяпла і пяшчоты, усмешак і кветак! Няхай ва ўсім вам спадарожнічае поспех і ўдача. І смак хлеба.**

**РУП «Барысаўхлебпрам»**
**222120, Рэспубліка Беларусь, г. Барысаў, пр-т Рэвалюцыі, 78.**
**Т./ф. 76 20 43, 76 20 40.**
**e-mail: Vodarhleba2@tut.by**
**УНП 600009710**
**Барысаў 01777 3 26 63.**
**Вілейка 01771 5 44 02.**
**Жодзіна 01775 3 61 63.**
**Маладзечна 01773 7 04 84.**
**Нясвіж 01770 5 57 04**
**Салігорск 01710 5 43 40**

# VIVASAN — ВОЛШЕБНОЕ ПРИКОСНОВЕНИЕ ПРИРОДЫ

***Компания «Вивасан» является Генеральным представителем в России, СНГ, Прибалтике, Европе и Азии ряда крупных швейцарских фирм — производителей косметических средств и натуральных ароматических масел, а также итальянской декоративной косметики, изготавливаемых только из натуральных компонентов.***




***Vivasan — 12 лет на рынке.***

**ТЕЛЕФОН: (375 17) 213 26 36.**

Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ВІВАСАН». УНП 190268952.

**Кампанія Vivasan віншуе ўсіх прадстаўніц цудоўнай паловы чалавецтва з надыходзячым святам — 8 Сакавіка. Жадае дарагім жанчынам цудоўнага вясенняга настрою, сямейнага шчасця і дабрабыту.**

Інфарм-укол

## САЛОДЗЕНЬКІ СЫРОЧАК



**Глазураваныя сыркі — вынаходніцтва выключна айчыннае. Нідзе ў свеце іх больш не вырабляюць. У прамысловых маштабах сыркі пачалі выпускаць яшчэ ў 60-х гадах.**

Рэцэпт класічнага сырка вельмі просты. Аснова — тварог, малако і цукар. Ад тлустасці тварагу залежыць і каларыйнасць сырковай масы. Дадаванне вяршкоў і сметанковага масла не толькі ўплывае на смак, кансістэнцыю, але і прыўносіць у сырок тлушчараствaральныя вітаміны — А і Д. Пасля перамешвання інгрэдыентаў тваpожную масу ахаладжваюць. З яе фармуюць бруські, разразаюць іх на порцыі, нарэшце, глазуруюць. Глазура рыхтуецца на аснове какавы-парашку, але ў яе склад уваходзяць таксама раслінныя тлушчы, цукар, лецыцін, ванілін. Захоўваецца сырок нядоўга: пры 2—4 градусах — пяць сутак з моманту выпуску. Праўда, дома сыркі можна замарозіць і захоўваць даўжэй.

А КАМУ — НЕ НА КАРЫСЦЬ

1. Тварожныя прадукты не пойдуць на карысць тым, хто не пераносіць бялку каровінага малака.
2. Асцярожным варта быць з тварагом і пры захворваннях нырак. У гэтым выпадку лепш пракансультавацца з урачом.
3. Тварожныя дэсерты з жэлацінам, крухмалам і фарбавальнікамі не рэкамендуюцца дзецям ва ўзросце да 3 гадоў.
4. У выпадку алергіі на шакалад замяніце глазураваны сырок тварожным дэсертам, які не ўтрымлівае яго, або сыркам, пакрытым белай глазурай. Уважліва чытайце склад напаўняльнікаў: калі ёсць алергія на пэўныя фрукты і ягады, прадукт варта выдаліць з рацыёну.
5. Самае важнае ў тварожных сырках — іх свежасць. Абавязкова чытайце на ўпакоўках тэрмін годнасці і звяртайце ўвагу на ўмовы захоўвання іх у магазіне. Перш чым набыць сырок, пераканайцеся, што ўпакоўка навобмацак халодная.

**Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 35.018. Індэкс 63850. Зак. № 1267. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12